ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№18 (5074) 15 мая 2020 г. ISSN 0024-4686

16+

Выкшталцоная гульня стар. 7

Філасофія тэкстылю стар. 14

На паліцах «Беларусьфільма» стар. 15

Зорка Стэфаніі Станюты

Фота прадастаўлена Нацыянальным акадэмічным тэатрам імя Янкі Купалы.

Студзень-люты 1987 г.

Стэфанія Станюта — з тых актрыс, якія змаглі стаць сапраўднымі легендамі кінематографа і тэатра. Яна пражыла доўгае і цікавае жыццё. На яе долю выпалі рэвалюцыя, вайна, сталінскія рэпрэсіі. Дваццатае стагоддзе прамільгнула перад яе вачыма.

Знакамітая актрыса тэатра імя Янкі Купалы на адным са сваіх юбілеяў так танчыла, што маладыя калегі са здзіўленнем пыталіся: «А вам сапраўды шэсцьдзясят?» Пазней гэтак жа здзіўляліся: «Няўжо семдзесят, восемдзясят?» Сёлета народная артыстцы СССР і Беларусі споўнілася б 115 гадоў. Юбілейная дата стала добрай нагодай, каб згадаць самыя цікавыя старонкі лёсу таленавітай і яркай Стэфаніі Міхайлаўны.

Працяг на стар. 4 ▶

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 20018

«ЛіМ»-акцэнты

Дзяржава. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў суайчыннікаў з Днём Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга. Як адзначыў Прэзідэнт, беларускі народ прайшоў складаны шматвяковы шлях да незалежнасці, неад'емнай часткай якой з'яўляюцца герб і сцяг. Разам з гімнам гэтыя найважнейшыя нацыянальныя сімвалы садзейнічаюць кансалідацыі грамадства, захаванню пераемнасці пакаленняў, натхняюць на новыя здзяйсненні на карысць Айчыны. «Упэўнены, што толькі разам мы зможам паспяхова адказваць на ўсе выклікі часу, эфектыўна развіваць эканоміку, умацоўваць і абараняць суверэнітэт і бяспеку Беларусі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Сімволіка. Дэпутаты рыхтуюць да першага чытання змяненні ў закон «Аб дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь». Плануецца, што ў дадатку да яго з'явяцца эталонная выява Дзяржаўнага сцяга і яшчэ тры колеравыя версіі Дзяржаўнага герба, інфармуе БелТА. Ідэалагічны змест дзяржаўных сімвалаў Беларусі застаецца нязменны. Карэкціроўка не запатрабуе дадатковых затрат. Папраўкамі таксама прадугледжана пашырэнне сферы прымянення дзяржаўных сімвалаў. У прыватнасці, у законапраекце прапісана іх выкарыстанне ў час спартыўных спаборніцтваў, спартыўна-масавых, культурна-відовішчных мерапрыемстваў і г. д. Папраўкі ў закон уносяцца з улікам сучасных эстэтычных уяўленняў, новых магчымасцей, якія з'явіліся ў мастакоў дзякуючы камп'ютарным тэхналогіям.

Конкурс. Міністэрства інфармацыі запрашае да ўдзелу ў рэспубліканскім творчым конкурсе «Пад знакам Года малой радзімы!». Асноўныя мэты — рэалізацыя задач дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі ў развіцці рэгіёнаў краіны, фарміраванне павагі да малой радзімы, дэманстрацыя яркіх дасягненняў па зберажэнні і адраджэнні роднай старонкі, садзейнічанне выхаванню ў моладзі патрыятызму і любові да Радзімы праз паняцце «малая радзіма», фарміраванне актыўнай жыццёвай пазіцыі. На конкурс прадстаўляюцца матэрыялы, апублікаваныя ў друкаваных СМІ, сеткавых выданнях і на інтэрнэт-рэсурсах, або тыя, што выйшлі ў эфір тэлевізійных ці радыёвяшчальных СМІ на працягу 2019 года. Матэрыялы накіроўваюцца ў Міністэрства інфармацыі не пазней за 15 ліпеня з пазнакай «На конкурс».

Тэме малой радзімы прысвечаны і другі сезон рэспубліканскага творчага конкурсу «Кніга з экрана» па творах беларускіх аўтараў, паведамілі ў БРСМ. Да ўдзелу запрашаюць школьнікаў, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў, студэнцкую і працоўную моладзь. Гэта могуць быць як індывідуальныя ўдзельнікі, так і творчыя групы. Прысвечаныя Году малой радзімы 1,5-хвілінныя міні-фільмы, створаныя пачаткоўцамі — сцэнарыстамі, аператарамі і рэжысёрамі, якія папулярызуюць тую або іншую кнігу, прапаноўваецца стварыць па творах беларускіх аўтараў. Другі сезон стартуе 18 мая. Вынікі плануецца падвесці ў пачатку жніўня.

Памяць. Калектыў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны стварыў перасовачную экспазіцыю «Перамога 75: дарогамі мужнасці і славы». Плануецца, што ў хуткім часе мабільны музей накіруецца ў патрыятычны марафон па гарадах Беларусі. Экспазіцыя распавядзе пра 27 гарадоў Беларусі, узнагароджаных вымпелам «За мужнасць і стойкасць». Наведвальнікі даведаюцца, чым вызначыўся кожны горад, за што быў узнагароджаны і якія людзі яго праславілі. Падчас экскурсій супрацоўнікі музея раскажуць аб канкрэтных героях вайны, якімі ганарыцца краіна. Гэта беларусы і ўраджэнцы Беларусі, якія ўдзельнічалі ў першых баях з гітлераўцамі, абаранялі Маскву, Ленінград, змагаліся ў падполлі і партызанскім руху, вызвалялі Беларусь і іншыя краіны, дайшлі да Берліна.

Кіно. Па праекце «Для мяне кіно важней за жыццё», прысвечаным 80-годдзю з дня нараджэння кінарэжысёра Валерыя Рубінчыка, у Музеі гісторыі беларускага кіно пачала працаваць аднайменная тэматычная выстаўка. Наведвальнікі могуць убачыць арыгінальныя кампазіцыі з узораў рэквізіту, касцюмы, эскізы дэкарацый, рэжысёрскія распрацоўкі, кадры з фільмаў і плакаты да іх, спецыяльнае асвятленне. Выстаўка знаёміць наведвальнікаў з найбольш знакавымі фільмамі Валерыя Рубінчыка, які быў таленавітым стылізатарам і ўзбагачаў свае карціны выразнымі падрабязнасцямі, датычнымі як адносін аўтара да сваіх герояў, так і яго бачання канкрэтнай гістарычнай эпохі, распавялі арганізатары. Галоўны акцэнт зроблены на фільмах гістарычнай тэматыкі — «Дзікае паляванне караля Стаха» паводле аднайменнай аповесці Уладзіміра Караткевіча і «Магіла льва» па матывах беларускіх легенд.

Афіцыйныя падзеі ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

сумоўе

Героя-беларуса памятаюць у Казані

Імя Івана Кабушкіна аднолькава дарагое для жыхароў Беларусі, Расіі і Татарстана, дзе прайшлі дзяцінства і юнацтва нашага земляка. Нарадзіўся ён у Баранавіцкім раёне.

Менавіта 8 мая 2020 года споўнілася 55 гадоў з таго моманту, як адважнаму арганізатару мінскага антыфашысцкага падполля было прысвоена (пасмяротна) званне Героя Савецкага Саюза. «І хаця мы знаходзімся ў самаізаляцыі, — распавёў, пазваніўшы ў Мінск народны паэт Татарстана, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі Рэнат Харыс, — мы памятаем і ўшаноўваем імя Івана Кабушкіна ў гэтыя майскія дні, падчас святкавання 75-годдзя Вялікай Перамогі. Героя ўспамінаюць татарскія масмедыя, грамадскія і творчыя дзеячы. Мы ведаем, што подзвігу Кабушкіна ў акупіраваным гітлераўцамі Мінску прысвечана адна з кніг беларускага журналіста і празаіка Івана Новікава "Руіны страляюць ва ўпор". А наш пісьменнік Шаміль Ракіпаў напісаў пра героя аповесць "Адкуль ты, Жан?", якая выйшла на татарскай мове і ў перакладзе на рускую».

Нагадаем, што герой-падпольшчык сустрэў вайну лейтэнантам паблізу заходняй мяжы Савецкага Саюза. За плячыма ў Івана ўжо былі Халхін-Гол, савецка-фінская кампанія. У першыя дні баёў з ворагам трапіў у палон. Знаходзіўся ў фашысцкім канцлагеры ў Мінску. З дапамогай мясцовых жыхароў змог уцячы. Па заданні кіраўніцтва мінскага падполля і камандавання партызанскіх атрадаў выратоўваў людзей з лагера смерці, здабываў боепрыпасы, зброю, медыкаменты. Быў кіраўніком аператыўнай групы Мінскага падпольнага гаркама партыі. Падпольныя мянушкі — Жан, Бабушкін, Саша, Назараў. 4 лютага 1943 года пры выкананні баявога задання быў схоплены гітлераўцамі і загінуў у турме.

У Мінску і Баранавічах ёсць вуліцы, названыя ў гонар Івана Кабушкіна. Герою-падпольшчыку ўсталяваны помнікі, пра яго расказваюць экспанаты ў школьных музеях Брэсцкай вобласці.

— У нас ёсць яшчэ адна агульная трапяткая тэма, — зазначыў Рэнат Харыс, — ушанаванне памяці пра подзвіг татарскага кампазітара-франтавіка Фарыда Яруліна, які загінуў у кастрычніку 1943 года. Ён пахаваны ў брацкай магіле на 468-м кіламетры аўтамагістралі Масква — Мінск у Дубровенскім раёне. Камандзір стралковага ўзвода 19-га танкавага корпуса лейтэнант Фарыд Ярулін — аўтар музыкі да першага татарскага нацыянальнага балета «Шурале». У Дуброўне імем Ф. Яруліна названа дзіцячая школа мастацтваў.

Рэнат Харыс часта бывае ў Беларусі, сябруе з многімі нашымі літаратарамі. У Татарстане пабачылі свет кнігі беларускай паэзіі ў яго пераўвасабленні на татарскую мову. На старонках гэтых выданняў ёсць і творы беларускіх паэтаў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

конкурсы

Па найлепшых узорах

Нацыянальная бібліятэка Беларусі падрыхтавала конкурс да 85-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна і запрашае да ўдзелу школьнікаў 4—11 класаў. Прымаюцца плакаты з цытатамі творцы і эсэ.

Па ўмовах канкурсу ўдзельнікі чытаюць творы Рыгора Барадуліна і выбіраюць любую цытату з творчай спадчыны пісьменніка, якая спадабалася, а затым афармляюць плакат у адпаведнасці з варыянтамі на выбар: выкарыстоўваючы дызайнерскае рашэнне плаката, прапанаванае на партале Нацыянальнай бібліятэкі, альбо асабістым мастацкім афармленнем. Затым яны пішуць невялікае эсэ з тлумачэннем выбару цытаты, сканіруюць творчую работу і дасылаюць разам з эсэ на электронную пошту *konkurs.baradulin85@gmail.com* альбо выкладаюць у сацыяльнай сетцы *Facebook* з хэштэгамі *#konkurs_baradulin85 #cytata_baradulin.*



Фота з сайта nlb.by.

Мэты конкурсу — павышэнне цікавасці навучэнцаў да беларускай мовы і літаратуры, прыцягненне ўвагі да важнасці чытання, выхаванне падрастаючага пакалення на найлепшых узорах нацыянальнай літаратуры, садзейнічанне ўкараненню дадатковых форм навучання, а таксама пашырэнне магчымасцей для самарэалізацыі і развіццё творчага патэнцыялу вучняў.

Тры пераможцы, якія зоймуць I—III месцы, будуць адзначаны памятнымі дыпломамі, бясплатнай экскурсіяй па бібліятэцы (з наведваннем музея кнігі і пад'ёмам на аглядную пляцоўку) для ўсяго класа альбо сяброў удзельніка конкурсу, фотасесіяй падчас экскурсіі, размяшчэннем конкурснай работы і інфармацыі пра аўтара на партале бібліятэкі і ў навукова-метадычным часопісе «Выхаванне і дадатковая адукацыя», кнігамі, падарункавымі пакетамі з прадукцыяй выдавецтва «Адукацыя і выхаванне». Акрамя галоўных пераможцаў, будуць адзначаны яшчэ дзесяць найлепшых работ.

Конкурсныя работы прымаюцца да 31 ліпеня. Вынікі будуць абвешчаны да 28 жніўня.

Яўгенія ШЫЦЬКА

актуальна

Культурны каранцін

Як віцебскія музеі прываблiваюць наведвальнікаў

Віцебскі абласны краязнаўчы музей далучыўся да міжнароднага праекта *#MuseumWeek*, які сёлета ладзіцца ў сацыяльных сетках. Таксама ў ім удзельнічаюць музей-сядзіба Ільі Рэпіна «Здраўнёва», мастацкі музей Віцебска і Музей гісторыі прыватнага калекцыянiравання.

Першы дзень тыдня музеяў быў прысвечаны медыкам, якія знаходзяцца на перадавой барацьбы з каранавірусная інфекцыяй. Запісы па тэме можна знайсці ў сацыяльных сетках па хэштэгу #ГероіMW. Удзельнікі акцыі сталі мадэлямі для фотасесій па матывах знакамітых карцін і перадалі падпісчыкам эстафету ў творчым чэленджы #КультураНаКаранціне.

Адзін з дзён арганізатары праекта прысвяцілі тэме згуртаванасці, у якой развілі думку наконт таго, што дзякуючы агульным намаганням жыхары планеты адолеюць пандэмію (#СумеснаMW).

На выхадных карыстальнікі сацсетак пазнаёмяцца з цікавай гісторыяй аб працы музейных супрацоўнікаў па шматлікіх публікацый газет пад хэштэгам #МузейныяІмгненніMW.

У суботу таксама адбудзецца шэраг мерапрыемстваў, якія прысвецяць кліматычным зменам і звязаным з імі праблемам (#КліматMW). Спецыялісты раскажуць пра тэхналогіі і іх значэнне ў развіцці музейнай справы (#ТэхналогііMW).

Вікторыя АСКЕРА

праекты

Сучасны тэатр у пошуку гісторый

Кожнаму, незалежна ад досведу, ёсць, што распавесці іншым. У сучасным свеце гэта можна зрабіць вельмі проста — праз сацыяльныя сеткі. Інфармацыйная прастора паказвае, што асабістыя гісторыі цікавыя іншым, але зрабіць свой аповед зразумелым для гледача на ўсіх узроўнях — сапраўднае мастацтва.

Ужо пяты раз конкурс-фестываль сучаснай беларускай драматургіі *WriteBox* распачаў прыём заявак. З 1 мая па 31 жніўня беларускія і замежныя аўтары могуць накіраваць работы на конкурс па намінацыях «Новая п'еса» і «П'еса для дзяцей».

Слоган конкурсу-фестывалю ў 2020 годзе — «Тут распавядаюць гісторыі». Гэтыя словы адлюстроўваюць лад жыцця і вобраз мыслення, звыклы для людзей інфармацыйнага веку. Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца і ўжо дасведчаныя аўтары, і тыя, хто толькі пачынае свой творчы шлях. Арганізатары імкнуцца стварыць прастору для адкрытай камунікацыі і пляцоўку, дзе можна будзе пачуць галасы сучаснасці.

На першым этапе конкурсу прафесійнае журы, у якое ўвайшлі беларускія тэатразнаўцы, тэатральныя крытыкі, рэжысёры, акцёры і драматургі, прааналізуе ўсе дасланыя работы і складзе шорт-ліст з найлепшых. На другім этапе будуць арганізаваны чыткі і абмеркаванні п'ес фіналістаў і адукацыйная праграма для драматургаў.

Задача праекта — хутка рэагаваць на новыя тэксты беларускіх аўтараў, падтрымліваць іх прасоўванне, даследаваць тэндэнцыі і асаблівасці беларускай драматургіі і ствараць пляцоўку для прафесійнага развіцця сучасных беларускіх аўтараў.

Тэатразнаўца Вікторыя Белякова, кіраўнік *WriteBox*, акрэслівае канцэпцыю сёлетняга конкурсу-фестывалю так: «Як растлумачыць, што такое п'еса? Гэта гісторыя, смешная, драматычная, іранічная ці абсурдная, нескладная або ўрывачная. Няважна, якая, таму што мы розныя, па-рознаму бачым свет і рэагуем на яго.

WriteBox-2020 — запрашэнне да даследавання свету вакол вельмі канкрэтных нас, сённяшніх, у іншым тысячагоддзі, у новай рэальнасці. І нас, якія распавядаюць сваю гісторыю».

Конкурс *WriteBox* праводзіцца з 2016 года і пастаянна ўключаны ў беларускі тэатральны працэс. Больш падрабязна з умовамі конкурсу і палажэннем можна азнаёміцца ў сацыяльных сетках праекта. П'есы на конкурс прымаюцца ў электронным выглядзе да 31 жніўня 2020 года на скрыню *writebox.fest@yandex.ru*.

Дар'я СМІРНОВА

зваротная сувязь

Пра старую яблыню ды іншае

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя праекты. У суботу і нядзелю ў праекце «Паэтычная раніца» прагучыць радыёкампазіцыя «Абрус». Праграма «Паэзія XXI стагоддзя» прапануе вершы Рыгора Барадуліна.

Публіцыстычныя праекты выхаднога дня «Кнігалюбу» і «Запрашаем у кнігарню» пазнаёмяць з літаратурнымі падзеямі і кніжнымі навінкамі, чакаецца агляд штотыднёвіка «ЛіМ». У нядзелю ў радыёверсіі праграмы «Суразмоўцы» слухайце гутарку Навума Гальпяровіча з пісьменнікам, дзяржаўным дзеячам і дыпламатам Іванам Карэндам.

У «Літаратурнай анталогіі» з панядзелка да пятніцы агучваюцца старонкі кнігі Івана Шамякіна «Трывожнае шчасце», у «Радыёбібліятэцы» — рамана Эрыха Марыі Рэмарка «Трыумфальная арка». «Літаратурныя гісторыі» ў выхадныя ў вячэрні час прапануюць апавяданні Уладзіміра Лідзіна «Старая яблыня» і Марыі Вайцяшонак «Восень мая доўгая».

У межах праграмы «Радыётэатр. Лепшае» ў суботу прагучыць другая частка радыёверсіі спектакля «Радавыя» па аднайменнай п'есе Аляксея Дударава, а таксама апавяданне Івана Навуменкі «Дрэвы над вадою». Нядзельным вечарам прыхільнікаў тэатра чакае радыёспектакль «Несцерка» паводле Віталя Вольскага.

Штовечар а 21 гадзіне для маленькіх слухачоў на «Культуры» выходзіць «Вячэрняя казка», а па буднях у праекце «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» на наступным тыдні прагучаць першыя старонкі кнігі Раісы Баравіковай «Галенчыны "Я", альбо Планета Цікаўных Хлопчыкаў».

імпрэзы

Уганаравалі творцу

Да 80-годдзя пісьменніка Віктара Казько ў Брылёўскай сельскай бібліятэцы Магілёўскага раёна падрыхтавалі інфармацыйны буклет і кніжную выстаўку «Пакуль жыве жаданне жыць», якую ўпрыгожылі кнігі з аўтографамі творцы, адрасаваныя чытачам Брылёўскай бібліятэкі.

Наведвальнікі кніжніцы пазнаёміліся з творчасцю юбіляра, а дырэктар Брылёўскага сельскага Дома культуры пісьменнік Мікалай Яцкоў распавёў пра свае сустрэчы і сяброўства з Віктарам Апанасавічам, для якога самае галоўнае — каб беларускае слова даходзіла да сэрцаў чытачоў.

Творчасць пісьменніка яркай старонкай упісана ў беларускую літаратуру, за што ў 1982 годзе Віктар Казько быў уганараваны Дзяржаўнай прэміяй імя Якуба Коласа. Прыемны падарунак атрымаў ад землякоў — яго прозвішчам (пры жыцці!) назвалі адну з новых вуліц у Калінкавічах Гомельскай вобласці, дзе ён нарадзіўся.

Юлія ЯЦКОВА

рэйтынг

Лідары продажаў

Каранавірус не спыняе працу кнігарань ААТ «Белкніга», у якую ўваходзіць 101 гандлёвы пункт.

Пацікавімся, што з выданняў набываецца хутчэй. Нагадаем: у айчынным дзяржаўным кнігагандлі па-ранейшаму істотную частку складаюць кнігі расійскай вытворчасці. Але беларускія кнігавыдаўцы актыўна запаўняюць гандлёвыя паліцы.

Што датычыць лідараў продажу, то на першым і другім месцах — два буквары (другі — так званае міні-выданне) расійскага выдавецтва «Эксмо». Аўтар — Н. Жукава. Куплена адпаведна 655 і 345 экзэмпляраў. Прадалі ў «Белкнізе» і шмат асобнікаў кнігі Д. Оруэла «1984. Скотны двор» — 331 экзэмпляр. На чацвёртым месцы — Наталля Батракова з другой часткай рамана «Бесконечность любви, бесконечность печали» (242 асобнікі). Гэтае выданне — прадукт беларускага выдавецтва «Ікселент». На пятым месцы — перакладная кніга Выдавецтва Андрэя Янушкевіча «Гары Потэр і філасофскі камень» (прададзена 196 экзэмпляраў.).

У першую сотню выданняў з найбольшым рэйтынгам продажаў уваходзяць і кнігі беларускіх аўтараў — Уладзіміра Караткевіча (тры назвы), Івана Мележа, Віктара Марціновіча.

Мікола БЕРЛЕЖ

ЛіМ КАЛЯНДАР

16 мая 65 гадоў спаўняецца Сяргею Слюсарэнку, пісьменніку-фантасту.

16 мая — 90 гадоў з дня нараджэння Віктара Чарнабаева, спевака, народнага артыста БССР.

16 мая — 70 гадоў з дня нараджэння Ігара Паліводы (1950—1996), кампазітара, педагога.

17 мая — 175 гадоў з дня нараджэння Мікалая Нікіфароўскага (1845—1910), этнографа, фалькларыста, літаратара, педагога.

18 мая 85-гадовы юбілей святкуе Алесь Каўрус, мовазнаўца.

18 мая 80-годдзе адзначае Ян Чыквін, паэт, літаратуразнаўца, перакладчык.

18 мая 60 гадоў спаўняецца Пятру Янушкевічу, жывапісцу.

20 мая — 105 гадоў з дня нараджэння Дзмітрыя Жураўлёва (1915—1988), музыказнаўца, кантрабасіста.

20 мая — 80 гадоў з дня нараджэння Міколы Вяршыніна (1940—2010), паэта-сатырыка, гумарыста.

21 мая 50-гадовы юбілей святкуе Уладзімір Даўгяла, мастак, графік, педагог.

22 мая — 120 гадоў з дня нараджэння Мікалая Каспяровіча (1900—1937), краязнаўца, лексікографа, мастацтвазнаўца, літаратуразнаўца, крытыка.

22 мая — 90 гадоў з дня нараджэння Івана Цішчанкі (1930—2001), фалькларыста, літаратуразнаўца, крытыка.

22 мая — 85 гадоў з дня нараджэння Леаніда Гаўрылкіна (1935—1989), празаіка, драматурга.

22 мая 80-годдзе адзначае Віталь Бутрымовіч, артыст балета, балетмайстар.

22 мая — 80 гадоў з дня нараджэння Леаніда Крука (1940—1982), акцёра.

Ідзе падпіска на II паўгоддзе 2020 г.

«ЛіМ»	1 месяц	падпісны індэкс
Для індывідуальных падпісчыкаў	8 р. 07 к.	63856
Ведамасная падпіска	22 р. 02 к.	638562
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў	5 р. 66 к.	63815
Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі	16 р. 72 к.	63880

Саюз пісьменнікаў Беларусі выказвае глыбокае спачуванне члену СПБ Алене Іванаўне Харашэвіч у сувязі са смерцю бацькі — настаяцеля мінскага храма Марыі Магдаліны, протаіерэя Іаана Харашэвіча.

«ЛіМ»-люстэрка

Па ініцыятыве Пасольства Беларусі ў Францыі прайшоў шэраг мерапрыемстваў у межах святкавання 75-годдзя заканчэння Другой сусветнай вайны і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў. Напярэдадні Дня Перамогі пасол Беларусі ў Францыі Ігар Фісенка і супрацоўнікі пасольства ўсклалі вянок да манумента савецкіх ваеннапалонных і ўдзельнікаў французскага руху супраціўлення, кветкі на магілы беларускіх і расійскіх салдат на могілках горада Нуае-Сэн-Мартэн. У перадсвяточны тыдзень у сацсетках пасольства была арганізавана акцыя «Беларускія песні Перамогі» з мэтай паказаць унёсак беларускіх спевакоў, кампазітараў і паэтаў у стварэнне самых знакамітых ваенных песень СССР. У Дзень Перамогі прайшоў відэаканцэрт, падрыхтаваны Пасольствам Беларусі ў Францыі сумесна с Пасольствам Расіі. Удзел узялі ветэраны вайны і працы, народныя і заслужаныя артысты Беларусі і Расіі, беларуская і расійская дыяспары ў Францыі.

Беларускія сенатары ратыфікавалі пагадненне аб супрацоўніцтве краін — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў у галіне музейнай справы. Гэтым пагадненнем прадугледжваецца рэалізацыя сумесных выставачных праектаў і навуковых праграм, супрацоўніцтва ў перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі музейных работнікаў, абмен вопытам па ўкараненні сучасных тэхналогій у арганізацыі выставак у галіне захоўвання, рэстаўрацыі і кансервацыі музейных прадметаў, а таксама выраб і абмен іх электроннымі копіямі. Як адзначыў міністр культуры Беларусі Юрый Бондар, раней супрацоўніцтва ў музейнай сферы грунтавалася толькі на прынцыпах добрасуседства.

Венецыянскі кінафестываль пройдзе ва ўстаноўленыя даты. Прэзідэнт біенале Раберта Чыкута запэўніў: кінаагляд па-ранейшаму запланаваны з 2 па 12 верасня. Ён пракамендаваў нядаўнія чуткі, што дырэкцыя Канскага кінафестывалю плануе аб'яднацца з італьянскімі калегамі для правядзення сумеснага кінаагляду. Але нават гіпотэза такой формы правядзення адсутнічае. Як паведамляе РІА «Новости», сёлета міжнароднае журы 77-га Венецыянскага кінафестывалю ўзначаліць уладальніца «Оскара», актрыса і прадзюсар Кейт Бланшэт. Поўны склад калегіі, у якую ўвойдуць 7 чалавек, будзе абвешчаны пазней.

У Вялікабрытаніі выставяць на таргі нявыпушчаную песню ўдзельнікаў *The Beatles* Пола Макартні і Рынга Стара, паведамляе РІА «Новости». Касета з дэмазапісам кампазіцыі *Angel in Disguise* стане адным з лотаў на аўкцыёне, які пройдзе 19 мая. Паводле ацэнак аўкцыённага дома *Omega Auctions*, цана касеты можа дайсці амаль да 25 тысяч долараў. Доўгі час кампазіцыя захоўвалася ў калекцыі дыджэя і былога праграмнага дырэктара радыёстанцыі *Radio Luxembourg* Тоні Прынса. Лічыцца, што менавіта на *Radio Luxembourg* упершыню была выпушчана ў эфір музыка ліверпульскай чацвёркі.

Прэм'ера новага праекта рэжысёра Юрыя Быкава пройдзе ў сетцы ў 2021 годзе, гаворыцца ў матэрыяле РІА «Новости». Шматсерыйны фільм пад рабочай назвай «Нуль» з'явіцца на анлайн-платформе «КиноПоиск *HD*». Зараз аўтар працуе над сцэнарыем. «Гэты фільм пра складанае і глыбокае супастаўленне нашага часу і эпохі, калі ў агоніі сыходзілі 90-я і наступала новая, здавалася, светлая эра нулявых. Гэта гісторыя пра тое, як змянілася Расія за 20 гадоў, кім сталі героі мінулага зараз і хто героі нашага часу, але галоўнае — пра тое, кім сталі мы і куды мы ідзём», — цытуе агенцтва словы рэжысёра са спасылкай на прэс-службу сэрвісу «КиноПоиск *HD*».

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Зорка Стэфаніі Станюты

Сям'я і захапленні

Актрыса нарадзілася ў Мінску 13 мая 1905 года. Дарэчы, у адзін год з зоркай сусветнага кіно Грэтай Гарбо, якую Стэфанія Міхайлаўна ведала па фільмах, захаплялася яе прыгажосцю. Сябе прыгажуняй ніколі не лічыла. Хоць заўсёды ганарылася фігурай. Да канца дзён была высокай, стройнай. Шмат рухалася, хадзіла, у ежы была непераборлівая, гатаваць не любіла, ды, увогуле, не было калі. Усё жыццё актрыса прысвяціла працы і тэатру.

Бацька Стэфаніі (а так яе назвалі ў гонар бабулі па-бацьку) — мастак. Маці была малапісьменнай, да замужжа працавала наймічкай у багатых дамах. Маладая сям'я жыла небагата. У хаце пахла не ежай, а шкіпінарам, свежымі фарбамі, дрэвам ад падрамнікаў. Каб былі нейкія грошы, мама спрабавала перапрадаваць соль і смятану. Смятану купляла ў сялян у Лошыцы, а прадавала на базары ў Мінску. Зарабляла на гэтым капейкі, але і ім была рада. А дома, каб забяліць боршч, саскрабала смятану са сцен бітончыка. Бацькі дома амаль ніколі не было: то ў Маскве, то ў Мінску — увесь час маляваў.

Карціна, з якой Міхаіл Станюта ўвайшоў у гісторыю беларускага нацыянальнага мастацтва, — партрэт дачкі, выстаўлены цяпер у Нацыянальным мастацкім музеі. Партрэт удалося вярнуць з Германіі, куды ён быў вывезены падчас Вялікай Айчыннай вайны. Большасць жа яго карцін даваеннага часу знікла без следу.

— Аднойчы, калі летам гасцявала дома, бацька вырашыў напісаць мой партрэт, а можа, я сама прапанавала або папрасіла, — расказвала пра легендарны партрэт Стэфанія Станюта. — Усё адбылося хутка і проста, без падрыхтоўкі. У блакітнавата-шэрай сацінавай сукенцы з кароткім рукавом, з вузкім беларускім паяском на галаве, я села на стале, падціснуўшы ногі, абапіраючыся на стол рукамі і гледзячы кудысьці ўбок, а абедзве касы ляглі на калені. Хутчэй за ўсё, гэта я сама і прыдумала пазіраваць менавіта так, таму што ўспамінаю, як рабіла фон, развешваючы сінію хустку і замацоўваючы на ёй нешта накшталт бантаў з чырвонай гафрыраванай паперы. Бацька за адзін ці два сеансы напісаў партрэт (глядзіце здымак на 1-й стар.)

Дзяўчынка любіла танцаваць і ў будучыні бачыла сябе балерынай. Яна часта хадзіла маліцца і, як пісала ва ўспамінах, аднойчы ўбачыла, як Хрыстос з распяцця ёй падмяргнуў. Гэты выпадак яна запомніла на ўсё жыццё. А яшчэ Стэфанія памятала, як упершыню ўбачыла тэатр і захапілася ім. Але тады і ўявіць не магла, што стане вядомай актрысай.

Стэфанія Станюта вучылася ў царкоўна-прыходскай школе, потым у гімназіі. Ёй нават давялося паўдзельнічаць у сустрэчы цара Мікалая II. Стоячы з іншымі вучаніцамі на пагорку Саборнай плошчы (сёння плошча Свабоды), яна бачыла, як цар са світай пад'язджаў да дома губернатара.

У гімназіі Стэфанія яшчэ больш захапілася танцамі. За гнуткасць і грацыёзныя рухі яе празвалі Лілі. Пазней яна стала ўцякаць на танцы пры кожным зручным выпадку.

Магчыма, менавіта танцы адыгралі вызначальную ролю ў прафесійным лёсе актрысы. З 1918 года Стэфанія Станюта ўжо працавала статысткай, харысткай і танцоркай у Першым таварыстве беларускай драмы і камедыі, якім кіраваў Фларыян Ждановіч. Праз два гады на базе таварыства быў арганізаваны Першы Беларускі тэатр, пазней перайменаваны ў Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы.

Пачатак кар'еры

Сёння тэатр успрымаецца як забаўляльная ці выхаваўчая форма адпачынку. Але на пачатку XX стагоддзя, калі Стэфанія Міхайлаўна пачынала кар'еру, усё было інакш. Уявіце толькі: ні тэлебачання, ні радыё не было, газеты — рэдкасць. І тэатральная трупа, трапляючы ў мястэчкі, была здольная здзейсніць пераварот ва ўяўленні чалавека пра свет. Тэатр з'яўляўся велізарнай культурнай сілай.

14-гадовая Стэфанія ўдзельнічала ў хоры, масоўках, згаджалася выходзіць на сцэну з любой нагоды і ў любым вобразе. Так і атрымала першы ганарар — два злотыя. Яна іграла невялічкую ролю ў п'есе з чарадзейным сюжэтам, дзе выконваліся ўсе жаданні героя: на дыбачках у жоўтай папяровай пачцы выходзіла на сцэну пасля слоў «Запаліць бы трубку!» з люлькай у руках. Маці заробку дачкі была вельмі рада.

Аднак першыя два выхады Стэфаніі ў ролях «са словамі» аказаліся правальнымі. Ёй было толькі шаснаццаць гадоў. Аднойчы трэба было замяніць актрысу ў п'есе Францішка Аляхновіча «Бутрым Няміра». Баярына Няміра іграў сам Аляхновіч, а Стэфанія — яго раўнівую жонку. Маналог яе быў кароценькі, але маладая артыстка зніякавела: так-сяк прамовіўшы першую фразу, яна знямела і не змагла гаварыць далей.

Праз некаторы час у таварыстве Фларыяна Ждановіча ставілі п'есу Уладзіслава Галубка «Ганка». Стэфаніі Міхайлаўне дасталася невялікая роля Хімкі. Трэба было выйсці на сцэну і сказаць: «Ганка ў калодзежы ўтапілася». Замест гэтага гледачы пачулі «Хімка ў калодзежы ўтапілася». У зале ўсе зарагаталі, дэбютантка ў жаху ўцякла са сцэны.

Маскоўскі перыяд

Пасля дзвюх няўдалых спроб у тэатры актрыса, прыпісаўшы сабе некалькі гадоў, разам з сяброўкай паехала вучыцца тэатральнаму майстэрству ў Маскву.

Быў лістапад 1921 года. Студыйцы жылі ў інтэрнатах, у службовых памяшканнях кінатэатра «Арс» на Арбаце, потым у старых будынках на Чырвонай Плошчы. Да іх у госці заходзілі, бываючы ў Маскве, беларускія паэты, празаікі. Сярод іх — Я. Колас, З. Бядуля, Ц. Гартны. У Стэфаніі быў маленькі альбомчык (ён захоўваўся ў актрысы шмат гадоў), куды прасіла гасцей з Мінска напісаць некалькі слоў.

Жылі студыйцы надгаладзь. Уся ежа — хлеб і маргарын. Яшчэ разводзілі ў вадзе муку. Але голаду ніхто заўважаў. Жылі высокім мастацтвам. А яно было побач. МХАТ. Спектаклі Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі... Васіль Качалаў, пра якога казалі, што ў яго беларускія карані, Міхаіл Чэхаў, Айседора Дункан, фантазіі, умоўнасці спектакляў У. Меерхольда, першыя пастаноўкі Вахтангава.

Выпускных спектакляў студыйцы паставілі два: «Сон у летнюю ноч» і «Цар Максіміліян» — класіку Шэкспіра і народную драму. Шэкспіра пераклаў на беларускую мову паэт Юрка Гаўрук, Стэфанія іграла каралеву фей Цітанію.

Віцебск. Вяртанне

У 1926 годзе студыйцы з Масквы пераехалі ў Віцебск і стварылі там Другі драматычны тэатр. Сёння гэта Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа. З маладымі артыстамі ў Віцебск прыехалі і маскоўскія рэжысёры. Але ў тэатральныя справы занадта актыўна пачалі ўмешвацца мясцовыя чыноўнікі. Так, сакратар абкама партыі настойліва рэкамендаваў тэатру падзеі старажытнагрэчаскай п'есы «Псіхея» павярнуць да рэвалюцыі. І ператварыць Псіхею ў перадавую рабочую, абавязкова з чырвонай хусткай на галаве. Маскоўскія рэжысёры вырашылі адмовіцца ад работы ў Віцебску.

Аднойчы ў горад над Дзвіной прыехаў паэт Уладзімір Маякоўскі — каб распаўсюдзіць свой рэвалюцыйны часопіс «Леф». Маякоўскі выступіў у тэатры. А Стэфанія Міхайлаўна пад вялікім уражаннем ад выступлення папрасіла ў яго аўтограф. Яна купіла часопіс «Леф», і на яго вокладцы паэт намаляваў артыстцы кветку з пяццю пялёсткамі.

У Віцебску Стэфанія Станюта іграла даволі шмат. «Там я была зоркай», — успамінала яна пасля. Выступала ў самых розных п'есах: ад камедый да антычных трагедый. Гледачам вельмі запомнілася яе Таццяна з п'есы «Разлом».

Фота Каспуся Дробава.

Фрагмент экспазіцыі, прысвечанай Стэфаніі Станюце, у Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь.

У 1931 годзе актрыса пераехала ў Мінск і пачала працаваць у тэатры імя Янкі Купалы, якому прысвяціла 70 гадоў прафесійнага жыцця. І, хоць ужо тады было зразумела, што Стэфанія Міхайлаўна выдатная актрыса (пластычная, тэмпераментная, эмацыянальная, цудоўна валодае словам, жэстам, мімікай), іграць ёй давалі другарадныя ролі. Толькі Леанід Рахленка ў сваім спектаклі «Ваўкі і авечкі» па Астроўскім даверыў маладой артыстцы ролю Глафіры. Прыгожую, хітрую, падступную Глафіру Станюта сыграла цудоўна, а потым зноў былі маленькія ролі — другога, трэцяга планаў. У тэатры актрысу называлі Станюткай.

Асабістае жыццё

З кавалерамі праблем у актрысы не было, нават даводзілася адбівацца. Маладая студэнтка мадэльных параметраў з выразным тварам, якая насіла па модзе таго часу кепі, шалік, стэк у руцэ… Хто толькі да яе не заляцаўся! Аднакурснік Канстанцін Саннікаў рэгулярна «іграў» раўнівага мужа дзяўчыны, каб ад Стэфаніі адчапіліся чарговыя кавалеры.

У гады вучобы ў Маскве Стэфанія Станюта закахалася і выйшла замуж за акцёра гэтай жа студыі Васіля Рагавенку. Дырэкцыя выдзеліла маладым па 10 рублёў. На гэтыя грошы Стэфанія купіла сабе туфлі-лодачкі і фільдэперсавыя панчохі. У іх і рэпеціравала. Маладыя разам іграліў спектаклі «Цар Максіміліян». А ўлетку, на вакацыях, упершыню паехалі на мора, у Крым. Там, як успамінала актрыса, аб'ядаліся баршчом і белым хлебам.

Пражылі яны разам нядоўга, разышліся ўжо ў Віцебску. Лёс Васіля склаўся трагічна: у 1930-я яго, яркага, кампанейскага, па недарэчным абвінавачванні звольнілі з тэатра падчас чарговай палітычнай кампаніі па выяўленні ворагаў. Ён трапіў у лагер у Магаданскі край на 13 гадоў.

Другі муж Стэфаніі Міхайлаўны Аляксандр Кручынскі, ваенны-кавалерыст, быў родам з Мінска. Артыстка пазнаёмілася з ім падчас гастроляў, калі акцёраў накіравалі ў кавалерыйскі полк вучыцца верхавой яздзе. Аляксандр быў інструктарам Стэфаніі Станюты. Яны пажаніліся, нарадзіўся сын. Але акцёрскае жыццё дзяўчыны і яе пастаянныя раз'езды нервавалі рашучага мужа-кавалерыста. Ён прымушаў яе кінуць тэатр. Напярэдадні вайны яны разышліся.

Прыход немцаў заспеў другога мужа і сына актрысы ў Мінску. Стэфанія ў гэты час была на гастролях у Адэсе, іх трупу эвакуіравалі ў Томск. Вельмі баялася за сына. У томскай эвакуацыі пачаўся і скончыўся трэці кароткі шлюб Стэфаніі Міхайлаўны. Мужам быў калега па тэатральнай трупе, значна маладзейшы за яе. Ён памёр у халодным і галодным сібірскім тылавым горадзе ад хваробы.

Сын Стэфаніі Станюты Аляксандр стаў літаратуразнаўцам, доктарам навук. Яны ўсё жыццё былі вельмі блізкія: сёння мы маем магчымасць чытаць маналогі актрысы дзякуючы таму, што іх клапатліва запісаў у свой час Аляксандр Аляксандравіч.

Кіно

Упершыню ў кіно Стэфанія Станюта сыграла яшчэ ў 1958 годзе. Але шмат здымацца стала ў 1970—1980-я гады. Яна выканала каля 60 роляў. Знялася ў знакамітым фільме «Людзі на балоце» рэжысёра Віктара Турава, любімых многімі «Белых Росах» Ігара Дабралюбава.

Галоўны фільм актрысы, які зрабіў яе зоркай, — «Развітанне». Рэжысёр Ларыса Шапіцька, якая пачынала гэтую карціну і неўзабаве трагічна загінула ў аўтамабільнай катастрофе, запрасіла Стэфанію Міхайлаўну фактычна без проб, хоць славілася сваёй скрупулёзнасцю ў падборы акцёраў. Чаму яна выбрала беларускую актрысу на ролю сібірскай сялянкі Дар'і — загадка. Калегі расказвалі, што яе ўразіў твар актрысы і яе неверагодная статнасць.

Калі пасля гібелі Шапіцькі карціну прадоўжыў здымаць яе муж Элем Клімаў, ён памяняў амаль усіх акцёраў, а Станюту пакінуў. Пасля шумнага поспеху фільма «Развітанне» Стэфанія Міхайлаўна заставалася такой жа сціплай, нават сарамлівай. Адзінае — пачала часта адлучацца на здымкі, ездзіць па кінафестывалях і даражэй апранацца.

Да знешняга выгляду актрыса заўсёды была даволі абыякавая. І апранацца ёй часта дапамагала яе любімая нявестка. У гардэробе актрысы з'явіліся раскошная дублёнка, модныя паліто, футра, якое Станюта насіць саромелася. Яна заўсёды ўспамінала свае даваенныя сукенкі з адбеленага лёну, якія бацька распісваў арнаментам, падобным да тога, што ўпрыгожваў Слуцкія паясы.

Хобі

У Стэфаніі Станюты было захапленне — упрыгажэнні. Але не звыклыя — з золата і камянёў, а з жалудоў, ягад шыпшыны і рабіны. Актрыса збірала іх сама, дадавала кукурузу, фасолю альбо макароны і рабіла пацеркі, прыгожыя бранзалеты.

Пайшла з жыцця Стэфанія Міхайлаўна ў 2000 годзе. Пражыла сваё жыццё годна. Ніколі нікому не зайздросціла, нікога ні аб чым не прасіла. Стэфанія Міхайлаўна была не толькі таленавітай актрысай, але і добрым, вельмі спагадным чалавекам.

Сын актрысы выдаў некалькі кніг успамінаў пра маці. Першая выйшла на беларускай мове ў 1994 годзе, а дапоўнены варыянт на рускай — «Жыццё актрысы» — у 2001 годзе. Да 105-годдзя з дня нараджэння актрысы Аляксандр Станюта выдаў новы раман «Гарадскія сны».

Вікторыя АСКЕРА

Якуб Колас з прысвячэннем «Стэфцы Станюце на памяць»

Я пайду, міну лясочкі,
Што чарнеюць, нібы бровы, —
Там пабачу я свет новы,
Там пацешу свае вочкі,
Там другія ўчую словы.

За ляскамі, за тым гаем,
Далі, лёгшы сінім морам,
Вабяць душу мне прасторам
І чаруюць новым краем,
Клічуць к нейкім ясным зорам.

Я йду смела, сэрцу люба,
А ў дарозе травы, краскі
Мне гаворацъ свае казкі;
Мне смяецца постаць дуба,
Чараў поўная і ласкі…

Я ўсё йду; бяжыць дарога
То на ўзгоркі, то ў лагчыну.
Ветрык гойдае былінку,
Навявае думак многа
Мне пра родную краінку.

Я прайшла ляскі густыя,
Мой дзянёк гарыць высока;
Я на далі кіну вока —
Далі-мары залатыя
Ох, далёканька-далёка!

***

Адбягаюць мае далі,
Далі новыя відаць;
Падбівацца ножкі сталі —
Цяжка мне адной дыбаць!

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Радасць і смутак паэта

Шаравая маланка ў лёсе дачкі Янкі Журбы

Здымак Янкі Журбы для дачкі, які яна беражліва захоўвала ўсё жыццё.

Роднай вёскі беларускага паэта, педагога, перакладчыка Янкі Журбы (Івана Якаўлевіча Івашына) Купніна Чашніцкага раёна на Віцебшчыне даўно няма на карце Чашніччыны. Але там захаваліся рэшткі хаты, дзе нарадзіўся і працяглы час жыў паэт, а ў 1912-м нават прымаў Янку Купалу. У Чашніках яшчэ жывуць людзі, якія добра ведалі знакамітага земляка. Гэта яго вучні. Пасля вайны Журба працаваў настаўнікам спеваў у мясцовай школе. Старажылы ўспамінаюць: паэт быў адзінокі, слабавідушны. Як і многія даследчыкі яго творчасці, большасць чашнічан пераканана: ён ніколі не меў сям'і. У палоне такой ілюзіі доўгі час знаходзілася і я.

Выпадак дапамог мне даведацца ісціну. Неяк інтэрнэт-выданне «Віцебскі кур'ер» папрасіла зрабіць матэрыял пра Журбу. Нарыс выйшаў пад назвай «Янка Журба: чалавек з іншай планеты». Не чакала, што ім зацікавяцца ў замежжы. Але здарылася менавіта так. Адгукнуўся жыхар Санкт-Пецярбурга Уладзімір Мкртчан: «Вельмі цікавы матэрыял, але ў ім ёсць недакладнасць. У Журбы была дачка. Я жыў у яе сям'і…» Як? Пачала шукаць інфармацыю і натрапіла на артыкул Людмілы Рублеўскай, дзе сцвярджалася: Журба быў двойчы жанаты і меў дачку ад першага шлюбу. Я зацікавілася: чаму ж у сталым узросце ён жыў адзін? Тым больш вядома: смяротна хворага паэта даглядалі манахіні полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, якому раней Журба ахвяраваў сродкі. Звярнулася да Уладзіміра Мкртчана. Паміж намі завязалася перапіска і адбылася гутарка. Так мне адкрыліся невядомыя старонкі біяграфіі паэта і яго сям'і.

Мой суразмоўца прыехаў з Ерэвана ў Ленінград у 1963 годзе, паступіў у політэхнічны інстытут. Значна раней у горадзе на Няве апынуўся родны дзядзька юнака, таленавіты вучоны ў галіне прыборабудавання, лаўрэат Сталінскай прэміі Дэрэнік Мкртчан. Жонкай Дэрэніка была Іраіда Івашына, дачка Журбы. Іраіда працавала кіраўніком рабочай групы аднаго з ленінградскіх НДІ. Пара не мела дзяцей, пляменнік Дэрэніка стаў ім за сына. Нават пасля смерці дзядзькі Валодзя захаваў вельмі цёплыя зносіны з Іраідай, да апошніх яе дзён заставаўся адным з самых блізкіх для жанчыны людзей і таму добра ведае пра жыццё Іраіды.

…Адзінае дзіця Журбы нарадзілася ў Барысаве ў 1915 годзе. Карані маці, першай жонкі Журбы, Валянціны Іванаўны, таксама на Барысаўшчыне. Цёця Ціна (як звалі яе блізкія) — з вялікай сям'і. Барысаўскіх сваякоў было шмат, і маці з дачкой наведвалі іх. Абедзвюх у Беларусі чакалі не толькі сваякі, але і сябры, знаёмыя.

У паўночную расійскую сталіцу Іруся (як зваў яе бацька) прыехала, каб атрымаць вышэйшую адукацыю. У Ленінградзе жыў адзін з братоў маці Хрыстафор, які адразу ўзяў пад апеку пляменніцу. Іруся паступіла ў Ленінградскі электратэхнічны інстытут. На выбар зусім не паэтычнай прафесіі паўплываў выпадак. Члены сям'і Мкртчана не аднойчы чулі гісторыю аб прафесійным выбары.

…Чацвёра школьніц сядзелі за сталом каля адчыненага акна. А на дварэ грымела навальніца. Падлеткі не думалі пра небяспеку, і адбылася трагедыя. Прычынай смерці адной з дзяўчынак стала шаравая маланка.

Смерць сяброўкі прымусіла Іраіду задумацца аб прыродзе такіх з'яў, таму

Дачка паэта ў блакадным Ленінградзе.

яна і звязала жыццё з электратэхнікай. Але кола яе захапленняў было значна шырэйшае. Дачка Журбы, як сцвярджае мой суразмоўца, была асобай неабыякавай, таленавітай. Ёй ад бацькі перадаліся выдатныя музычныя здольнасці. Цудоўна іграла класіку на фартэпіяна. Вельмі любіла чытаць кніжкі, якія дасылаў Іван Якаўлевіч, і заўсёды ганарылася тым, што бацька — вядомы беларускі паэт.

Бацьку і дачку раз'ядналі абставіны і адлегласці (Івашыны разышліся, калі дзяўчынцы споўнілася ўсяго 8 гадоў). Абаім давялося прайсці праз цяжкія выпрабаванні часу. Горкі адбітак у лёсах пакінулі сталінскія рэпрэсіі, вайна.

Вядома, што ліхалецце саракавых Іван Якаўлевіч перажываў у акупіраваных Чашніках. Пры немцах узнавілася служба ў праваслаўным храме. Паэт меў добры голас і спяваў у царкоўным хоры. Пазней ён прызнаваўся земляку, пісьменніку Рыгору Рэлісу, што пасля акупацыі марыў паехаць у Мінск, працаваць у Інстытуце мовазнаўства АН БССР, як у 1930-я, але баяўся, што ўспомняць былое і прыпішуць супрацоўніцтва з фашыстамі.

Іраіда прайшла выпрабаванне блакадай. Перад вайной нарадзіла дзіця. У кватэры блакаднага горада жылі ўтраіх: Ціна, Іраіда і немаўля. Бабуля займалася ўнукам, маці працавала. У Мкртчана захаваўся фотаздымак з датай: кастрычнік 1942-га. На ім — моцна схуднелая дачка паэта…

Неяк з-за адсутнасці транспарту Іраіда некалькі дзён не магла дабрацца на працу. Па законах суровага часу гэта лічылася злачынствам, жанчыну арыштавалі, і яна апынулася ў Крыжах. Зняволенне працягвалася некалькі месяцаў. Пасля таго, як яна падала прашэнне на імя Сталіна, выпусцілі, а пазней рэабілітавалі.

Вяртанне дадому радасным не было. Убачыць адзінае дзіця ёй больш не давялося…

У 1951-м Іраіда выйшла замуж за Дэрэніка, але шчасця мацярынства больш не спазнала.

Яна не любіла ўспамінаць пра блакадны час, ніколі не клапацілася пра льготы, належныя ў сувязі з перажытым. Толькі ў пачатку дзевяностых, незадоўга да смерці Іраіды, Уладзімір Мкртчан заняўся яе дакументамі. У выніку дачка Журбы атрымала статус жыхара блакаднага Ленінграда.

Пасля вайны Іван Якаўлевіч, які ў 1941-м страціў другую жонку, Галіну, даведаўся пра ваенны лёс Ціны і дачкі. Як толькі з'явілася магчымасць пабачыць родных, паэт адпраўляецца ў горад на Няве. Марыў наладзіць зносіны з сям'ёй, клікаў Ціну і дачку ў Беларусь, але тыя на пераезд не згадзіліся. Паэт жа не мог без Радзімы.

Вестку аб смерці Журбы Івашыны-ленінградцы атрымалі, калі Ціна была на смяротным ложы. Адыходзіла яна вельмі цяжка і ўсяго на некалькі месяцаў перажыла былога мужа. Смерць забрала абаіх у 1964-м.

Іраіда пайшла з жыцця ў 1994-м ва ўзросце 79 гадоў. Ад бацькі яна ўнаследавала дрэнны зрок. У старасці амаль не бачыла. Пасля смерці Дэрэніка Уладзімір не раз прапаноўваў пераехаць у яго сям'ю. Іраіда адмаўлялася, не жадала абцяжарваць маладых. Да канца дзён заставалася вельмі добрым, чулым чалавекам, пра якога кажуць: ён жыў сэрцам…

Ірына ТОРБІНА

Здымкі з сямейнага архіва Уладзіміра Мкртчана.

Па няходжаных сцежках

Уласная жыццёвая дарога
Алеся Пальчэўскага
не была ўсыпана ружамі…
Алена Васілевіч

У Жабінцы, у сярэдняй школе № 1, праводзіўся Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі. Педагогі запрасілі выступіць мяне перад вучнямі, і я расказваў пра дзіцячы часопіс «Вясёлка», у якім друкаваўся звыш дзясятка гадоў, і сустрэчы з Васілём Віткам ды Алесем Пальчэўскім. Дзяўчынка паднесла нядаўна выдадзены двухтомнік выбраных твораў Пальчэўскага. Прыняў яго як штосьці вельмі блізкае да таго, аб чым расказваў дзецям.

Для мяне яны заўсёды стаялі поруч, разам працавалі ў «Вясёлцы»: Вітка — рэдактарам, а Пальчэўскі — адказным сакратаром.

Пра чалавечнасць і чуласць да людзей Алеся Восіпавіча не раз выпала чуць ад сяброў-пісьменнікаў. Пальчэўскі, вярнуўшыся з ГУЛАГа, імкнуўся дапамагаць людзям: за свой кошт праклаў ад станцыі Стоўбцы да роднай вёскі Прусінава зручную брукаваную дарогу, абгарадзіў сельскія могілкі. Хадайнічаў аб павышэнні пенсіі для сваёй суседкі, а калі нічога не атрымалася, са сваіх невялікіх заробкаў высылаў ёй штомесяц ананімна грошы.

Чалавечую далікатнасць і жаданне дапамагчы адчуў пры першым знаёмстве і я. Васіль Вітка, даведаўшыся, што вясковы настаўнік з Палесся прывёз апавяданні, перадаў мяне, як кажуць, у рукі Алеся Пальчэўскага, адказнага сакратара рэдакцыі, аўтара добрых твораў пра школу.

Я прывёз два апавяданні: «Ёлка» і «Ці прачнецца раніца?» Першае яўна не спадабалася Алесю Восіпавічу, і ён цярпліва і доўга даводзіў, як неабходна было павярнуць сюжэт, каб зацікавіць юнага чытача. Другое «Ці прачнецца раніца?» Пальчэўскаму прыйшлося даспадобы больш.

— Апавяданне харошае, — сказаў ён, — але ўзрост героя замалы для «Вясёлкі». Пашліце ў часопіс «Работніца і сялянка». У іх ёсць рубрыка «Мама, пачытай!». Думаю, возьмуць.

Прыехаўшы дадому, я запячатаў апавяданне ў канверт і паслаў. У той жа год, і сапраўды, яно было надрукавана ў «Работніцы і сялянцы». А сам засеў за апавяданне для «Вясёлкі».

Яно мела мудрагелістую назву «Гаючы чай з ліпавых кветак». Алесь Восіпавіч зрабіў прасцей: «Ліпавы цвет». Так, добразычлівасць і чуласць Васіля Віткі і Алеся Пальчэўскага спрыялі таму, што на многія гады я стаў не толькі чытачом, але і аўтарам гэтага выдання.

На жаль, махавік сталінскіх рэпрэсій, які ў тыя гады набіраў абароты, не абышоў і Алеся Пальчэўскага.

У аўтабіяграфічных нататках «Жыццёвыя сцежкі» пісьменнік успамінаў: з 26 лістапада 1936 года пачаўся новы перыяд у яго жыцці — «перыяд нягод і бясконцых вандраванняў па няходжаных сцежках» (быў рэпрэсіраваны 1.10.1937 г. і прыгавораны да 8 гадоў пазбаўлення волі. — **Заўв. рэд.**). Толькі ў жніўні 1946 года ён, набыўшы рабочую спецыяльнасць, вярнуўся з Горкаўскай вобласці ў Беларусь.

Дзесяць дарма змарнаваных гадоў. Сям'я распалася. Нарэшце знялі судзімасць, і Алесь Восіпавіч пачаў выкладаць у школах мову і літаратуру. У 1948 г. зноў асуджаны да высылкі, на пасяленне. Аказаўся ў Краснаярскім краі. Там стаў адметным цесляром і змог з гордасцю пазней заявіць, што «навучыўся ставіць дамы не толькі ў просты вугал, але і «ў замок». Многія нявыдуманыя гісторыі з перажытага леглі ў аснову яго апавяданняў, а яшчэ болей увайшло ў найлепшую аповесць «Сцежкі».

У апошнія гады Пальчэўскі моцна хварэў. Аднойчы Мікола Чарняўскі расказаў: Алесь Восіпавіч, як сцвярджае сам, памрэ 26-га чысла, бо гэта для яго — «чорны дзень»: менавіта дваццаць шостага ён быў двойчы незаконна арыштаваны. Алесь Пальчэўскі, і сапраўды, памёр 26 красавіка 1979 года.

Па словах Уладзіміра Юрэвіча, у апошні свой дзень Алесь Восіпавіч даводзіў да ладу той двухтомнік, што ўручылі мне вучні ў Жабінцы. Пальчэўскі распарадзіўся, каб пахавалі яго на Уздзеншчыне, у родным Прусінаве.

Аб пахаванні Сяргей Грахоўскі напісаў: «Праводзіла Алеся ў апошнюю дарогу ўсё сяло. Шлях да могілак жанкі акрапілі слязьмі. Трактарысты заглушалі машыны і без шапак ішлі па раллі развітацца са слаўным земляком, хадатаем і заступнікам, адданым людзям другам і заўсёды натхнёным мастаком слова».

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, што выпалі на долю пісьменніка, ён не ачарсцвеў душою. Бо Алесь Восіпавіч памятаў і да канца выконваў бацькаў наказ: «Перад табою, сынок, шырокая дарога ў свет. Ідзі па ёй, ды ніколі не забывайся, што ты чалавек». І ён вытрымаў экзамен на чалавечнасць, дапамагаў усім, хто меў патрэбу...

Расціслаў БЕНЗЯРУК

ЛІМБ #7: ДА_МОВЫ

А на крытычным фронце, як заўсёды, без змен: беларускія паэты або рыфмуюць на дзеясловы, або пішуць прыстойныя верлібры; пасля адны хваляць за разварушванне багны, пакуль іншыя ледзь не шлюць праклёны. Па-ранейшаму не робячы ніякіх літпалітычных зрухаў, выключна дзеля таго, каб са словам «стабільнасць» (асабліва ў літаратуры) асацыіравалася як мага больш пазітыўных і дынамічных з'яў, прапануем чытачу сёмы эпізод ЛІМБа. Гэта значыць, самы час патраціць свой месячны паёк бескампраміснасці, а можа, і перарабінгудзіць медалі рэпутацыі сучасных айчынных паэтаў.

Вось якімі фарбамі малюе свае вершаваныя эцюды **Іван КАРЭНДА**. Ужо ў першым вершы — і «*вечар на ложку ночы*», і «*сады-агароды*», і «*месяц-ліхтар*», а ў канцы — заканамерна зноў «*блішчыць сонца*». Чытачу нічога асаблівага гэтае паэтапнае апісанне руху ад вечара да раніцы не дае. Прысвячэнне Андрэю Федарэнку адкладаецца ў памяці аднакаранёвай (амаль таўталагічнай) рыфмай «*утульна — прытульным*». Траціну верша «Падземная Муза» займае рэфрэн, вакол якога такія вербальныя цагліны, як «*душэўныя гояцца раны*», «*спявае творчы настрой*» і «*абрыдзеў белы свет*». Асобная страфа мае назву «Крытыку» і ў сваім звароце падвяргае сумневу легітымнасць крытыкі дзеяслоўных рыфм. У адказ хочацца дадаць: менавіта з-за «роўных слоў», якія «жывуць у міры і згодзе» (а на мову ўнутранай драматургіі верша гэта можна перакласці як «адсутнасць напружанасці»), паэтычныя тэксты многіх беларускіх сучаснікаў выглядаюць як хлеб, які спечаны з пылу стаптаных метафар і вобразаў.

Алёна ПАПКО, як бачна, піша лёгка, натуральна, свежым і адначасова не прыцягнутым за валасы стылем. Гэта першае ўражанне. Калі ж прыгледзецца ды ўнікнуць — у вершах не знойдзеш свежай метафары, выкарыстоўваюцца заезджаныя: «*квяцісты май*» і «*квяцістае зорнае лета*», «*вецер новых надзей*», «*з галавою ў працу, як быццам у вір*» і г. д. Пейзажная лірыка вылучаецца непадзельнасцю з фігурай аўтара, што, з аднаго боку, надае тэкстам больш праўдзівасці, з іншага ж — кладзе на паэтку як бы падвойную адказнасць за штампы (за напісанасць і за перажытасць). Як прыклад больш «зямнога» верша Алёны — тэкст пад назвай «Бацькам». На жаль, і тут сустракаюцца месцы кшталту «*надвор'я кур'ёз*» (ці пасуюць словы адно аднаму?) і традыцыйнае — «*Мама, за працу нястомна-руплівую // Дай пацалую твае мазалі!*». Прыкладна тое ж можна сказаць наконт агульнага канструявання вобразных масіваў.

Верш «Вербніца» **Яўген ХВАЛЕЙ** пачынае з фармальнай дакументальнай замалёўкі, але ўжо праз дзве страфы пераходзіць да натуральнай замовы, якую некалі пачуў ад маці, — і менавіта на гэтым успаміне, а не на асабістых аўтарскіх мастацкіх знаходках, трымаецца ўвесь тэкст. У наступных трох вершах адчуваецца, што аўтар чэрпае натхненне не з самых павярхоўных паэтычных крыніц, але сам спосаб мыслення і пабудовы вобразных сувязей выдае ў аўтары прыналежнасць да праінфармацыйнай эпохі. У тэксце «Дзве незабудкі» паэт хаця і асэнсоўвае сваё цяперашняе існаванне ў «веку касмічным, камп'ютарным, хуткім», маўленчыя сродкі ніяк не адлюстроўваюць гэты час — толькі расплывіста і суха канстатуюць.

У вузкай прасторы трох тэкстаў **Валярына КУСТАВА** паспявае зарэкамендаваць сябе як аўтарка разнастайная. Першы твор — прысвячэнне Анатолю Сысу ў досыць традыцыйным метрычным выкананні, і хаця сэнсава яно не раскрывае адрасата з нечаканых бакоў, верш вылучаецца са звычайных слупкоў графічнай неаднароднасцю строф: знаходзіцца месца і для звыклай страфы, і для ўсечана-выцягнутай, з рэфрэнамі, і для кароткай паўстрафы-дыялогу. Другі верш, верлібр з назвай «Дамкі ўздоўж лініі берага», таксама цікавіць у першую чаргу сваёй тэхнічнай «падкладкай»: відавочная праца са словам прасочваецца і ў лексіка-сінтаксічным паралелізме ключавых момантаў твора («*дамкі ўздоўж лініі*» — «*думкі паўз лінію*»), і ў гнуткіх рэфрэнах, якія непрадказальна чаргуюцца паміж сабой, і ў дробных рытарычных прыёмах, якія добра працуюць на стварэнне тыпова-верлібрычных разгорнутых спіскаў-апісанняў. Апошні верш працягвае гульню з чытацкім успрыманнем. Пачынаецца ён ці не ў духу дзіцячай лічылкі, але пасля некалькіх усыпляльных радкоў б'е нечаканым «*на раз, два, тры — // твае пальцы ў мяне ўнутры*». І хаця з радка ніжэй даведваемся, што пальцы ўсяго толькі метафарычна «*намацваюць новы рым*», але эфект вертыкальнай прасторы паэтычнага тэксту робіць сваю справу. З часам тэкст разгортваецца ў такую сабе варыяцыю «*make love, not war*», а нават калі і не, то ва ўсякім разе ілюструе тонкасці жаночага свету ці мужчынаадчування.

Амаль уся падборка **Расціслава БЕНЗЕРУКА** складаецца з вершаў-прысвячэнняў, і, варта аддаць належнае, у кожным прасочваецца моцны біяграфічны пласт, які нацэлены на адзінага канкрэтнага адрасата. Збольшага мова зноў жа недзе з дашасцідзясятніцкіх часоў (што для сённяшняй перыёдыкі ўжо нямала), але часам кідаюцца ў вочы не самыя прыемныя рыфмы кшталту «*быццё — жыццё*», «*слова — мова*» (двойчы!), «*высакародны — родны*», «*хаце — маці*» (зноў двойчы!), «*паруску — Беларусі*» і «*помняць — помнік*». Хаця ёсць і яшчэ адно адхіленне: у палове вершаў у пэўны момант сэнс загадкавым чынам адхіляецца ў бок спантаннага ўсхвалення Беларусі,

што крыху парушае сувязь прысвячэнняў з іх адрасатамі.

У тэкстах **Галіны САМОЙЛЫ** прасочваецца пэўная «школа», больш за ўсё гэта можна адчуць праз рытміку і сусветна вядомыя вобразныя матывы. «Белая замець» — верш, які на першы погляд праводзіць вельмі даўнюю паралель паміж зімой і старэннем (праз колеравае падабенства снегу і сівізны), але на самай справе аніякага снегу тут няма: «*белая замець*» пазбаўлена пагоднага кантэксту і таму аказваецца з'явай выключна метафізічнага характару. Па сутнасці, адзін толькі гэты тонкі ход адсячэння непатрэбных сэнсаў ратуе тэкст ад пошласці, і таму мастацка-мінімалістычнае прыпадабненне «белага» да ўсяго свету і самой сябе ледзь-ледзь, але ўсё ж працуе. Наступны твор адметны пастрофавай арыфметычнай прагрэсіяй, і калі лічбы першых чатырох строф нясуць адпаведны сэнс (нават складваюцца ў суцэльнае апавяданне), у апошняй, пятай, на жаль, сэнс губляецца. Апошні верш, «Кропелька дажджу», з'яўляецца падставай для звычайнай рэфлексіі, якая з неаднаразовым паўторам звароту «*кропелька дажджу*» толькі робіцца больш відавочнай.

Са звыклай для сябе хрысціянскай лірыкай выступае ў друку **Алесь ДУБРОЎСКІ-САРОЧАНКАЎ**. Не ўпэўнены, ці гэта асаблівасці рэлігійнага дагматызму, ці творчыя рысы самога аўтара, але ў прыведзеных радках не адчуваецца амаль ніякай рэфлексіі (як карыснай, так і бескарыснай), і нават аўтарскі акцэнт на «*слове*» (пры наяўнасці хрэстаматыйных «*прарокаў-святароў*», «*цела*» і «*крыві*») мала што можа зрабіць, каб перабіць інтанацыю духоўна-асветніцкага буклета. А ўключэнне эпіграфаў з цытатамі «Евангелля» толькі дадае тэкстам падабенства да пропаведзяў, калі святар спачатку гаворыць пастве, якія вытрымкі даводзілася перачытваць нядаўна, і потым будуе сваю прамову вакол згаданых цытат. Аднак, падаецца, нават у сапраўдных святароў-аскетаў у прамовах часам больш жыцця, чым у трыпціху паэта, які часам нагадвае не столькі мастацкі тэкст (не ўлічваючы фармальныя рытмічна-клаўзальныя прыкметы), колькі вывучаны семінарскі ўрок.

Дастаткова цікавы выпадак атрымліваецца з вершамі **Віктара ЯРЦА**. Падборка паэта, бясспрэчна, багатая на тэмы: ёсць і ваенныя вершы, і тэксты, прысвечаныя Чарнобыльскай трагедыі, і лірыка па матывах успамінаў з дзяцінства. На ўзроўні мовы тэмы таксама раскрываюцца разнастайна, але сэнсавыя намаганні, на мой погляд, час ад часу сустракаюцца з невытлумачальнымі тэхнічнымі «прасадкамі» то з-за хісткай даўжыні радкоў, то з-за нечаканых халастых радкоў. І, на жаль, церпяць ад гэтага самыя сур'ёзныя вершы, якія ўздымаюць тэмы вайны і Чарнобыля. Але застаецца і другая палова падборкі, больш асабістая і гарманічная, у якой найбольш яскрава сябе паказвае верш з назвай «Неспакойнае цяпло».

Іван КАПЫЛОВІЧ адносіцца да таго тыпу аўтараў, у каго ўжо даўно складзена свая ўніверсальная і нязменная паэтычная мазаіка. Выдзелім самыя характэрныя мастацкія і наўпрост лексічныя сродкі з усіх трох надрукаваных вершаў: 1) «*лодка лёсу*», «*час тугі*», «*шматпакутны дзень*», «*прасторы*», «*сляды вечнасці*», «*нуда*», «*волю — болю*» (эфект дэталяў узмацняецца рыфменнай пазіцыяй), «*мяжы — імжы*» (тое ж самае), «*горыч смутку*», «*аб страчаным тужыў*»; 2) «*я адзінокі*», «*у палоне роздумаў глыбокіх*», «*стома*», «*таямніца*», «*крыніца*», «*дух волі*» (!), «*далі і прасторы*» (!), «*зорны шлях*»; 3) «*поле — болю*», «*трывога*», «*жыта*», «*каласы*», «*ніва*», «*лес густы*», «*прымроіў — прысніў*», «*пошумы бору*», «*водарам дыхаў палёў*», «*свабодаю дыхаў прастораў*», «*шлях*», «*забыццё*», «*вечная ісціна*», «*ніць тонкая лёсу*». Усё гэта падзяляецца на некалькі ёмістых груп: 1) патэтычныя пакуты (~10 моўных адзінак); 2) загадкавыя трансцэндэнцыі (~15 адзінак); 3) шырачэзныя прасторы (~6 адзінак); 4) пейзажы ўмеранага клімату (~6 адзінак). У выніку маем персаналію пакутлівую, з цягай да прастораў з размытымі межамі і любоўю да роднага краю. Свайго роду дасканалы партрэт сённяшняга сярэднестатыстычнага беларускага паэта?

Тэксты **Таццяны КРЭНЬ** заслугоўвалі б падрабязнага разбору, калі б складаліся з нечага большага, чым з тыпова жаноцкай рэфлексіі на тэму кахання з характэрна-рамантычнымі «*караблямі*», «*птушкамі*», а таксама рыфмамі «*ночы — вочы*» і «*маўчаць — кахаць*».

З маіх нядаўніх назіранняў вынікае тое, што сучасная беларуская паэзія (сучасная не па факце прапіскі ў часе, а па сваёй мове, якая фарміруецца сёння і зараз) сапраўды хутчэй схіляецца да верлібра. Гэта, безумоўна, не жалезнае правіла, але трэнд, за якім стаіць нешта большае, чым проста мода. Нават чым літаратура (а гэта — цэлы шэраг сацыяпалітычных абставін, прытым як унутры краіны, так і ў кантэксце найбліжэйшага суседства).

Данііл ЛЫСЕНКА

Сузіральнік і дэміург

Мы прывыклі, што пісьменнікі паводле кірункаў і стыляў падзяляюцца на традыцыяналістаў, наватараў, постмадэрністаў... Прычэпліваючы ярлыкі, літаратуразнаўцы спадзяюцца, што робяць добрую справу — дапамагаюць нам арыентавацца ў акіяне тэкстаў. Насамрэч жа атрымліваецца наадварот: карысці ад гэтага вобмаль не толькі чытачам, але і самім літаратарам, некаторыя з якіх ужо не могуць вырвацца за межы штампа.

Найбольш выйгрышная пазіцыя ў таго, хто без хайпу і самапіяру ў сацсетках спакойна робіць сваю справу, не ўдзельнічаючы ні ў прэміяльных звягах, ні ў ідэалагічных гульнях. Адмяжоўваючыся ад якіх-кольвек аналогій ды ўплываў, ён атрымлівае магчымасць адстаронена сузіраць, пераасэнсоўваць і занатоўваць праявы жыцця.

Кожны новы твор Андрэя Федарэнкі — гэта падзея. Прычым у першую чаргу для шанавальнікаў выверанага, бездакорнага стылю. Не з'яўляючыся прафесійным філолагам, пісьменнік упэўнена дае фору мовазнаўчай прафесуры ў плане чысціні тэксту, багацця лексікі, апраўданасці кожнага ўжытага слова, дакладнасці і трапнасці апісанняў.

Сваім новым раманам «Жэтон на метро», што нядаўна пабачыў свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура», Андрэй Федарэнка чарговы раз нагадаў, што ў сучаснай беларускай прозе яго пакуль ніхто не здольны перасягнуць. Гэтым разам ён прапанаваў чытацкай увазе твор, у якім паядналіся самыя розныя плыні — ад літаратурнага дэтэктыва да сацыяльна-псіхалагічнай прозы. Знешне лінейная структура рамана, дзе няспешна абмалёўваюцца характары, абставіны, інтэр'еры, як і большасць з напісанага Федарэнкам, — насамрэч тонкая, прадуманая мнагахадоўка, выкшталцоная інтэлектуальная гульня. Закалыханы фірмовым аўтарскім стылем, чытач і не падазрае, што традыцыйны, амаль караткевічаўскі зачын твора (вечар, пісьменнік, кава, цыгарэта, трывожны званок) — частка віртуознай інверсійнай кампазіцыі, калі развязка хаваецца на пачатку за шматлікімі зашыфраванымі спойлерамі. На працягу развіцця фабулы амплітуда чытацкіх схільнасцей і сімпатый будзе вагацца паміж пераплеценымі лёсамі, а галоўная інтрыга — хто забойца і ці было наогул злачынства — абвострыцца да крайняй ступені. І нават апошнія старонкі рамана пакінуць багата спажывы для ўяўлення, прымушаючы ўсур'ёз задумацца: хто ж ён такі, паэт Віктар Рак — сам апавядальнік? Прыдуманы персанаж? Alter ego аўтара? А нескарыстаны рарытэтны жэтон на метро — што гэта? Стратэгічны адпраўны пункт аповеду? Або адваротны бок медаля, страчаны шанец, што нават праз дзесяцігоддзі не дае спакою галоўнаму герою?



Нягледзячы на тое, што кожнаму ўдзельніку гэтай гісторыі, нібыта ў шахматнай партыі, нададзена асобная роля, ніводзін з іх не выглядае схематычна, усе — жывыя людзі з плоці і крыві. Апісваючы знешнасць персанажаў, аўтар трапна адлюстроўвае іх унутраны стан. Напрыклад, Віктар Рак: «…падстрыжаная галава з кароткай чупрынкай, твар… даволі сімпатычны, калі б не вочы: пукатыя, як у рака, заўсёды здзіўленыя, а цяпер яшчэ і ўстрывожаныя»; Самусенка: «…нос агурком, як у пажылога армяніна, адцягнутыя ўніз вочы-слівы, сівыя рэдкія валасы, мох на вушах, рабацінне на твары…»; Літаў: «Невысокі мацачок, прыкладна аднаго з Ракам веку… жвавы і пругкі — здавалася, калі пастукаць зверху па лысінцы, ён пачне адскокваць ад падлогі як мячык»; Асавец: «…дужы, высокага росту, падцягнуты… спакойны, без эмоцый, твар, роўны, бубнявы, без інтанацый, голас… як у вужа, не міргалі вочы»…

Тыпажы, выхапленыя пісьменнікам з вірлівай плыні сучаснасці, надзвычай разнастайныя, шмат у чым супярэчлівыя. Канфлікты паміж імі носяць глыбінны, светапоглядны характар, прымушаючы задумацца над нацыянальнай ідэнтычнасцю, моўнай праблемай, роляй творцы ў грамадстве, шматлікімі маральна-этычнымі пытаннямі. На прыкладзе апантанага беларушчынай іншаземца Літава, што збірае культурныя каштоўнасці і нават спрабуе напісаць гістарычную манаграфію, мы бачым распаўсюджаны сучасны тып хамелеона, для якога мімікрыя сталася спосабам існавання, набываючы вычварныя формы. Праўда, лінія Літава выглядае незавершанай, яго гісторыя не вытлумачана напоўніцу, а матывацыі не цалкам апраўданыя. Таксама і вобраз Лю, гэткай пасталелай інкарнацыі німфеткі Лаліты: невядома дзеля чаго аўтар намякае на паранармальныя здольнасці дзяўчыны, але тэму не развівае. Канечне, гэта можна і не лічыць за нестыкоўкі, улічваючы пэўную рэкурсію твора, закальцаванасць сюжэта ў самім сабе, што зноў жа яднае яго з яшчэ адным, менш вядомым раманам Набокава «Сапраўднае жыццё Себасцьяна Найта», дзе неадназначны фінал таксама прымушае ўсумніцца: а ці існаваў увогуле апавядальнік на самай справе альбо мы маем справу з хітрамудрай містыфікацыяй? А калі шукаць аналогіі непасрэдна ва ўзорах дэтэктыўнай літаратуры, то найперш прыгадваецца знакаміты раман Агаты Крысці «Забойства Роджэра Экрайда», дзе Пуаро высвятляе, што злачынца, насуперак усім канонам дэтэктыўнай літаратуры, не хто іншы, як… сам апавядальнік.

Вобраз састарэлага эксцэнтрычнага навукоўцы Самусенкі пры ўсёй гратэскнасці таксама выклікае супярэчлівыя пачуцці. З аднаго боку, гэта трагікамічны персанаж, самотнік, які страціў сына, а пасля і жонку. Але ж ён — бадай ці не адзіны з удзельнікаў гэтай гісторыі, які па-свойму пераадолеў унутраны крызіс і жыве ва ўласнай, збольшага ўпарадкаванай сістэме каштоўнасцей, хаця і не пазбаўленай скепсісу наваколля і ўплыву канспіралагічных тэорый, а на кожнае пытанне мае адметны і вычарпальны адказ: «…Памаглі!»

Праз умоўна дэтэктыўную фабулу аўтар раскрывае шэраг крызісаў грамадства. Гэта — творчая нерэалізаванасць, незапатрабаванасць айчыннай інтэлігенцыі, яе жыццё «па-за рэальнасцю», у своеасаблівай унутранай эміграцыі. Таксама — праблема павярхоўнага, прагматычнага стаўлення да культурнай спадчыны, нават больш дэструктыўнага, чым звычайная некампетэнтнасць. Літаў цынічна выношвае мару зрабіць у сваім бункеры музей фальшывых артэфактаў: «нібыта вершы і паэмы Міцкевіча на беларускай мове… нібыта фрывольныя навелы Скарыны… аповесць Яна Баршчэўскага, напісаная беларускай кірыліцай… крыж Еўфрасінні з медзі і з фальшывымі каменнямі, падробныя слуцкія паясы, куча несапраўдных *шчарбатых талераў* і берасцяных грамат-шыфровак». Ён песціць думку, што «…падробкі хутчэй прыцягнуць да сябе сапраўднае». Таму перад намі — свайго роду перасцярога ад празмернага захаплення сімулякрамі і ўсялякага перакройвання гісторыі на свой капыл.

Сваім новым раманам «Жэтон на метро», што нядаўна пабачыў свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура», Андрэй Федарэнка чарговы раз нагадаў, што ў сучаснай беларускай прозе яго пакуль ніхто не здольны перасягнуць. Гэтым разам ён прапанаваў чытацкай увазе твор, у якім паядналіся самыя розныя плыні — ад літаратурнага дэтэктыва да сацыяльна-псіхалагічнай прозы.

Што ж хацеў сказаць Андрэй Федарэнка сваім раманам? Які асноўны мэсэдж меўся быць данесеным да чытача? Кожны адшукае ўласны адказ на гэтае пытанне, а мы дамо слова самому аўтару-дэміургу, які напрыканцы прамаўляе: «Пішучы, забаўляючыся, гуляючы сам з сабою ў шахматы, ён (Віктар Рак. — **Я. Л.**) навучыўся ажыўляць людзей, мог па першым жаданні адпраўляць іх у нябыт і так сама вяртаць назад. Гэта было так нова, цікава, незвычайна, захапляльна — улада творцы над сваімі героямі! Больш за тое — нешта падказвала яму, што гэта і ёсць адзіная ў свеце сапраўдная ўлада, хаця б таму, што яна самадастатковая, ёй нічога не пагражае: ні выбары, ні рэферэндумы, ні путчы з рэвалюцыямі…»

Бадай, дзеля таго, каб перажываць гэты ні з чым не параўнальны досвед, пісьменнікі і ствараюць уласныя сусветы.

Янка ЛАЙКОЎ

«Рытм слоў» *vs* сціслась

Летапісная паэма «Замкавы час Беларусі» Ізяслава Катлярова, што выйшла сёлета ў выдавецтве «Беларуская навука» (даволі сур'ёзным для нашага часу накладам — 1000 экзэмпляраў), — своеасаблівы працяг кнігі «О, Беларусь, ты — гербная дзяржава!».

Аўтар імкнецца выказаць сваё меркаванне пра багацце нацыянальнай спадчыны, пра моц беларускага народа. Багата ілюстраванае выданне складаецца з дзвюх частак — арыгінальнага твора Ізяслава Катлярова і перакладу на беларускую мову Соф'і Шах. Кніга абяцае быць цікавай усім аматарам айчыннай гісторыі і гераічнага мінулага.

Аўтар прадмовы акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр Каваленя заўважае: «…павага да мінулага, любоў да народа і Радзімы — гэта ўнутраная духоўная сутнасць паэта. Творы аўтара яскрава дэманструюць яго грамадзянскую доблесць і духоўную сталасць». Сапраўды, ужо першыя радкі паэмы «Замкавы час Беларусі» напоўнены патрыятычным пафасам, які захоўваецца, то ўзмацняючыся, то слабеючы, на працягу ўсяго твора (звяртаемся да арыгінала): «И посреди земных веков, / у памяти на вздохе / я приобщаюсь ритмом слов / к неведомой эпохе». У прынцыпе гэтае імкненне «приобщиться ритмом слов» праймае ўвесь тэкст, бо, нягледзячы на роздумы і меркаванні апавядальніка (не будзе памылкай паставіць знак роўнасці з аўтарам), як персанаж мастацкай літаратуры з адмысловымі думкамі і пачуццямі ён усё ж адсутнічае, ды і выразнага сюжэта не назіраецца. Твор можна назваць вандроўкай па мінулым. Аснова — адвольныя разважанні, за якімі даволі складана сачыць, не ведаючы гісторыю Беларусі дэталёва. Асабліва гэта тычыцца зніклых будынкаў і персаналій, якія не на слыху: атаман Іван Залатарэнка, ваявода Сямён Сангушка, палкоўнік Якаў Галавацкі… Але часцей перад вачыма чытача паўстаюць Лідскі, Любчанскі, Мірскі, Нясвіжскі, Навагрудскі, Гальшанскі, Крэўскі, Лыскаўскі і многія іншыя замкі, а побач з імі — Альгерд, Кейстут, Вітаўт… І акурат наперадзе — Камянец — бацька ўсіх беларускіх замкаў.

Нягледзячы на імкненне да высокага стылю, асноўныя складнікі якога выяўляюцца ў тэксце як усхваленне стваральнікаў і горыч разбурэння ворагамі, аўтар час ад часу звяртаецца да гутарковых і нават жаргонных выразаў, як, напрыклад, ва ўрыўку пра Лідскі замак: «Им владеет уже и Войдыло / (из холопов он сам, — говорят), / стать Ягайлы советником рад, — / значит, время ему подфартило». У беларускамоўным варыянце фраза заканчваецца словамі «доля яму дагадзіла». У такіх выпадках узнікае пытанне, чаму для выдання не хапіла аднаго варыянта.

Але галоўным недахопам паэмы, на мой погляд, з'яўляецца моўны лішак і празмернае выкарыстанне адных і тых жа прыёмаў, якія спрацоўваюць 1-2 разы, але не болей. Напрыклад, трапна гучыць наступны выраз: «Это явь или всё же кошмары, / если даже сожжёное жгут?» Такая «гульня» ўзнікае далёка не аднойчы, прытым з немалым энтузіязмам: «Это — я? Где я? Зная, не знаю. / Удивлением не удивлён. / Вот и Гродно — слияньем времён. / В них вживаюсь иль ими вживаю / всё, что взглядом у взгляда беру, / всё, что взглядом я взгляду дарю». Ці па-за тэкстам паэмы, ці ў тэксце сэнсу ў гэтым бачыцца не вельмі шмат. Альбо ён настолькі неспасціжны, што патрабуе большага досведу не толькі літаратурнага, але і жыццёвага.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Георгій МАРЧУК

Пад небам Айчыны

Чую голас юнацтва далёкі

I.
Чую голас юнацтва далёкі,
Дом пад крыламі белых буслоў.
Там у небе жаўрук адзінокі
Запрашае прыехаць дамоў.

ПРЫПЕЎ
Туманы, туманы на Палессі
І над Нёманам сівы туман.
І гучаць на Дняпры нашы песні,
І кахае Марусю Іван.
Туманы, туманы на Палессі,
Над азёрамі сіні туман,
І гучаць на Дняпры нашы песні,
І кахае Марусю Іван.

II.
Да матулінай хаты дарога
Цераз жыта і першы укос.
Пах духмянага хлеба з парога
Наша сэрца кранае да слёз.

ПРЫПЕЎ

III.
Нагадае зязюля пра долю,
Зацвіце стары сад пад акном,
Праспявае жаўрук нам пра волю
І пра родны бацькоўскі наш дом.

ПРЫПЕЎ

Еду, еду ў Давыд-Гарадок

I.
Хоць далёка мы жывём,
Усё ж не забываем:
На радзіме ля акна
Маці нас чакае.
Госці будуць за сталом,
Цёплая бяседа.
Добра помняць звычай свой:
Паважай суседа.

ПРЫПЕЎ
Еду, еду ў Гарадок.
Пахне ўноч мяцёла.
Тут жыцця майго выток —
Родны дом і школа.
Сяду, сяду ў лодку я
З любаю жанчынай,
І адкрые нам рака
Нашы ўспаміны.

II.
Людзі ладзяць між сабой,
Трохі ганарысты.
Як гуляюць — пір гарой:
Хоць бяры ў артысты.
Свята кветак добры знак —
Ёсць чым ганарыцца.
Упрыгожвае сусвет
Кветачак сталіца.

ПРЫПЕЎ

III.
Звон Казанскае царквы
Еднасць нам мацуе.
Хто штодня дабром жыве,
У шчасці той пануе.
А Гарынь бяжыць, бяжыць
Аж да небакраю.
Богу дзякуем за ўсё,
Што сягоння маем.
ПРЫПЕЎ

Наша полька

I.
Гэта модна, што народна,
Што твая душа прымае —
Не забудзем сваю польку,
Што заўжды людзей яднае.

ПРЫПЕЎ:
Так чаруе, захапляе
Полька беларуская.
Усіх на плошчу запрашае
Полька беларуская.
Кожны знойдзе сабе пару
Пад баян і пад гітару:
Сват са свацця́й, кум з кумою,
Хлопец з дзеўчынай сваёю.

II.
Гэта свята, нас багата —
Сотні дзве і яшчэ столькі.
Праспявалі усе песні,
Людзі просяць нашай полькі.

ПРЫПЕЎ

III.
Гэта казка, калі ласка,
Запрашайце на спатканне —
Усім людзям разам скажам:
Шчасце там, дзе ёсць каханне.

ПРЫПЕЎ

Домік пад ліпаю

Месяц на небе, домік пад ліпаю,
Маці хавае скупую слязу.
Ведаю: трэба збірацца ў дарогу,
А як жа дзяцінства з сабой павязу?
Родную хату, крынічку святую,
Храм на ўзвышшы ты прыгадай.
Веру, любоў і нашу надзею —
Памятай свята, не забывай.

ПРЫПЕЎ:
Зорнае неба, домік пад ліпаю
Богам падорана, лёс наш з табой.
У рытме сталічным маем апору —
Крэўную повязь з радзімай малой.

Сонца над полем, у квецені вішня,
Песні матулі, наказы бацькоў.
З першым сваім каханнем сустрэча,
Радасць сямнаццаці нашых гадоў.
Бусел над лугам, кулік на балоце,
І лесам дарога да хаты вядзе.
Трэба ў знакі нашай падзякі
Вечна дабром упрыгожваць цябе.

ПРЫПЕЎ

Свята ў Мінску

I.
Звон старадаўніх сабораў Нямігі
У паветры развее сум і журбу.
Мужнасць і славу тваю векавую
У сэрцы сваім я зберагу.
Ціхая Свіслач нясе свае воды,
Ведаем радасць і помнім бяду.
На плошчу героям нашай Айчыны
Я пакланіцца сёння іду.

II.
Ад Камароўкі з самага ранку
У вечар зімовы і летні дзень
Каціць і каціць трамвай ў Серабранку —
І гэта такі яго працадзень.
Горад утульны, горад зялёны,
Мінск старажытны і малады,
Хочацца слухаць мне з аптымізмам
Рытм твой працоўны і шум грамады.

III.
Звон старадаўніх сабораў Нямігі
У паветры развее сум і журбу.
Мужнасць і славу тваю векавую
У сэрцы сваім я зберагу.
Горад мой родны, сталіца Радзімы,
Тут мая вуліца, дом і пад'езд.
Цягне дамоў пад крышу радзімую,
Цягне з далёкіх і бліжніх месц.
Ціхая Свіслач нясе свае воды,
Ведаем радасць і помнім бяду.
На плошчу героям нашай Айчыны
Я пакланіцца сёння іду.

Кацярына ЯНЧЭЎСКАЯ

Родны бераг

***

Антычнасці верныя лебедзі,
трохкутнікі белых франтонаў, —
плывуць ручнікамі вечнасці
ў вясновым тумане —
Дадому...

Восень у Шчорсах

Мовай бясконцасці
восень гаворыць,
у мностве адценняў
знаходзіць сэнс.
Гартаючы лісце, бы парадоксы,
па алеях штодзённасці
восень ідзе.
Шчырая,
не падманвае,
не жадае стаць
гаспадыняй палацаў і замкаў.
...Пра вопыт знікнення
нагадвае
летуценная восень
у Шчорсаўскім парку.

Адраджэнне

У глыбіні адчыненых дзвярэй —
ультрамарын, бы з фрэсак Адраджэння,
спагадліва накідвае на плечы
марскую свежасць, хвалі да вышынь
адроджанага сэрца...
Фрэскі Джота.
Гісторыя Святой Сям'і.
І запавет: не страціць здольнасць
бачыць —
ультрамарын нябеснага вітання
у глыбіні адчыненых дзвярэй...

Вочы

Сярод мітусні розных дзён
вочы блізкіх людзей
глядзяць у нашу сутнасць.
Светабачанне «тут і цяпер»
перакульваецца ў лістапад позіркаў.
Адтуль — з глыбіні —
лістапад на зямлі.
...Вочы твае — па-за межамі мітусні.

***

Запісваю кардыяграму болю
ў чарнавік
трываласці вясновай.
Навобмацак
прытульваю да сэрца
халодны сакавіцкі дождж.
Дзе я?
Дзе ты?
Праз боль і адзіноту
халодны дождж
складае летапіс сустрэч.
Кранаецца вясна тваёй далоні...
Збірае час
аўтографы падзей.
Бягу. У сакавік.
Праз страту, слоту...
Бягу з дажджом
У весні летапіс
сустрэч...

***

Чытаць
месяц люты
вуснамі кветак —
на беразе аголенай зімы...
Сачыць, як шэрая чапля вітае
заўзятых рыбакоў —
на беразе Нёмана.
Адчуваць рэха галаснікоў Каложы
у акварэльнай памяці зямлі...
Родны бераг —
суладдзе і абяздоленасць
адначасова...

***

Алаізе Пашкевіч (Цётцы)

У роднай старонцы
раса рассыпаецца гутаркай,
«Узоры на кроснах ткуцца», —
звярталася Цётка
да моладзі беларускай.
Мара: «Прасці доўгую
нітку быцця»...
Не забыць — быць шчаслівай
у роднай старонцы.
Час жніва хутка вучыць...

...Дзесьці далёка
падручнік несіратлівы чытаюць
лілеі...
Ты ўсміхаешся:
узоры на кроснах ткуцца...

Мова

Словы-цаглінкі жыцця.
Імгненне і вечнасць-супольнасць.
Сярод цемры — адзінокая вежа
чакае цяпла:
слоў на роднай мове.
Мова — лёс —
лесвіца ў вышыню
і наадварот.
Крокі. Цаглінкі. Імгненне і вечнасць.
Сярод маўклівай зімы — словы.
Чалавек чакае цяпла.
Дыханне. Размова. Малітва святла.
Дзейснае слова — падмурак Любові.

Фота Кастуся Дробава.

Паланэз сантэхніка

Апавяданне

Валеры ГАПЕЕЎ

Вой, Аленачка, такі год атрымаўся: распавяду — не дасі веры. Ды як пытаешся ўжо, то наперад скажу: цяпер я ведаю, якім бывае сапраўднае шчасце. Выбуховае, шчымлівае, калі сэрца замірае, а потым так грукае, быццам сама ты ўся — адно сэрца, і чуе яно за дзясяткі крокаў біццё другога сэрца. Праўду кажу…

Дык вось, здарылася тое ў сярэдзіне сакавіка. У нашай музычнай школе, прабач за натуралізм, туалет сапсаваўся. Наша дырэктар заяўку камунальнікам пакінула, прыходзіць сантэхнік. Мужчына малады, росту невялікага, увесь такі… ніякі, карацей. Не заўважаюць такіх жанчыны: сціплы, ціхі, усё ўздоўж сцяны імкнецца прайсці. Праўда, акуратны, у чыстым. Паказалі яму «фронт работы», самі ў класе фартэпіянным селі чай піць, да заняткаў з дзецьмі яшчэ гадзінка была.

Праз хвілін дваццаць ціхенечкі стук у дзверы — наш сантэхнік. Дакладвае: усё зрабіў. Гукаем яго чаю выпіць, а ён аднекваецца, але і не сыходзіць. У вачах вінаватасць, мнецца:

— Прабачце, спытаць хацеў. Мне трэба… Хачу навучыцца іграць паланэз Агінскага. Вось.

І зачырванеўся, бы пра нешта непрыстойнае спытаўся.

— А на якім інструменце? — толькі і змагла адна дырэктар справіцца са здзіўленнем.

— Дык… На такім, каб прыгожа.

Мы пераглядваемся, смех у сабе душым.

Піяністка наша хуценька сядае за піяніна і пачынае іграць.

— Прыгожа? — пытаецца.

— Ага, вельмі! Ды… Мне такі інструмент, каб панесці.

— Вы сур'ёзна, малады чалавек? — адкрыта ўсміхаецца дырэктар. — Вам трэба навучыцца іграць адну мелодыю? На нейкім інструменце, які можна насіць з сабой?

— Ага, — узрадаваўся сантэхнік. — Адну. Паланэз Агінскага. Я заплачу, канешне, вы не думайце.

— Тады — гітара!

— Баян!

— Скрыпка!

— Віяланчэль!

Ужо смяёмся ўсе адкрыта, і ён усміхаецца. Пытае:

— А каб… паслухаць?

Поруч скрыпка якраз ляжала, я ўстала з-за стала і сыграла першую частку.

У мужчыны вочы загарэліся, кажа ўпэўнена:

— Вось! Навучыце мяне гэтак!

— Навучыць выкананню адной мелодыі? Але так нельга, — адказваю цвёрда. — Вы думаеце, зможаце запомніць чыста механічна?

— А як можна?

— Ды так, як вы… як вы вучыліся свайму майстэрству, — тлумачу. — Пачынаць з азоў — вучыць ноты. Ды і, прабачце, неабходны самы мінімум музычнага слыху.

— А ці нельга за год навучыцца? Ну, з гэтымі нотамі і ўсім?

Мы бачым, чалавек не жартуе.

— За год — атрымаецца, — згаджаюся я. — Толькі ў нас сфарміраваны класы, дый мы — дзіцячая школа мастацтваў.

— А магчыма індывідуальна? Я маю грошы, праўда. Заказаў многа, будуюцца людзі… Колькі скажаце, столькі і буду плаціць. І ў любы час, у любы дзень. Я змагу, я старацца буду…

І ў вачах яго застывае чаканне выраку. Адчуваю: скажу зараз «не» — як смяротны прысуд вынесу. Дзяўчаты не ўсміхаюцца ўжо. Адчулі раптам: сур'ёзнае нешта ў чалавека, далібог жа. Піяністка зірнула на нас, мы ёй вачыма падказалі: давай. Яна гукнула мужчыну:

— Падыдзіце сюды.

Той паслухмяна падышоў.

— Зараз адвярніцеся, націсну клавішу — пачуеце гук. Пасля націскайце самі розныя клавішы і спрабуйце ўгадаць, якую клавішу я націснула. Зразумелі?

Ён згодна заківаў галавой, зачырванеўся ад хвалявання. Але гук запомніў і потым амаль угадаў. І яшчэ двойчы: адзін дакладна, другі раз — блізка. Такім чынам, слых у яго быў, тое мы яму і сказалі. Як ён расцвіў — нібыта ўжо навучыўся іграць!

— Усё, Ірачка, бяры сабе вучня! — кажа мне дырэктарка.

І ён мне гэтак умольна:

— Вазьміце, калі ласка…

Я падумала: як убачыць ноты — збяжыць. Што трэба мужчыне такога ўзросту? Добры адпачынак з півам, жанчыны, рыбалка-паляванне-футбол… Ці мне не ведаць? Муж такі быў, збег. Я нядоўга сумавала, у мяне — мая Волечка. Час які імклівы — ёй ужо восем, яна — цымбалістка. Ты гэта знаеш. Спытала я ў мужчыны:

— А жонка ці будзе пускаць на заняткі?

— Няма жонкі, — адказаў ён і зноў чамусьці зачырванеўся.

Правіла ў нашай школе простае: індывідуальныя заняткі — дома.

Дамовіліся сустрэцца з ім заўтра. Выходзім з Волечкай са школы — чакае на ганку. Пагаварылі. Выявілася: жыве ў пакоі ў інтэрнаце, побач — сям'я з дзіцём. Карацей, вучыцца — толькі ў мяне. Тут пашанцавала: бацькоўскі дом, хопіць месца, нікому замінаць не будзем. Сказала яму пра сярэдні кошт.

— Канешне, канешне, — заспяшаўся ён, усё адно як баяўся, што я перадумаю.

Вось павер: ніколі раней я такога вучня не мела! Уяві: з дарослай адказнасцю і разуменнем і адначасова з паслухмянасцю і сціпласцю дзіцяці! Ну, проста ідэальнае спалучэнне. Сказала яму: скрыпка — інструмент, як там яго ключ ці дрыль. І ён вечар скрыпку і смычок у руках круціў, пра кожную дробязь распытваў, смычок сам націраў, спрабаваў-правяраў...

Заняткі ў нас былі праз дзень, плаціў ён адразу за кожны ўрок, а пасля і наперад прапанаваў. Мяркую, пачуў, як мая Волечка выпрошвала ў мяне нешта купіць, а я прасіла яе пачакаць. Мне тады было няпроста: адкладвала з зарплаты на рамонт, бо дом з пячным ацяпленнем, печка старая… Дарэчы, ён на трэцім занятку прапанаваў дапамогу: дровы прыносіў, сам і распальваў.

Гарадок наш — як вёска вялікая, ніц не схаваеш. Вось і ягоная тайна хутка вядомай стала. Як ужо хаваць не было сэнсу, ён і мне, ніякавеючы, прызнаўся: у рэстаране адзначалі свята калектывам. Яму адна жанчына з канторы падабалася, тое ўсе ведалі. Пачалі мужыкі іх сватаць за сталом, а яна жартуе: як сыграе ён мне паланэз пад акном — пайду замуж. Ён і выпаліў: сыграю! Праз год. Усе ўзрушыліся, у ладкі запляскалі. Як пачаў вучыцца — усяго і размоў у камунальнікаў: ці ўжо хутка пачуем мелодыю пад акном Зіначкі?

Мне і смешна было, і трошкі сумна. І зайздросна — вось жа, ёсць жанчыны, дзеля якіх ідуць на такія ахвяры…

Бо навучыцца іграць на скрыпцы ва ўзросце — гэта, лічу, ахвяра.

А мы пачалі пакрысе ўжо гамы асвойваць. Старанне ў майго сантэхніка не праходзіць, вочы гараць, як хоць з каліва новае атрымаецца. Імя ў яго цікавае — Стась. З Волечкай маёй пасябраваў. Ласункаў заўсёды прынясе, разам чай п'ём, Волечка яму дапамагае гамы праходзіць: яна — на цымбалах, ён — на скрыпцы. Зараз згадваю — такі час быў добры. Лета падышло, ён мне і кажа: «У вас газ падведзены, а печка стаіць, ды вялізная такая. Можна ж паравое ацяпленне зрабіць, сам магу ўсё зманціраваць». Быццам думкі мае прачытаў, а можа, я прагаварылася раней. Адважылася. А ён дадае:

— Ірына, я працаваць буду, мне плаціць за работу не трэба, вы адно вячэрай карміце. Бо не надта цяжка, а я ж напрактыкаваны, мне цікава...

Спрачацца з ім было дарэмна — я ўжо заўважыла ягоную цвёрдасць. Бываюць такія людзі: нібыта і мяккія, нерашучыя, а паспрабуеш — не нахіліць, не зламаць, бы стрыжань унутры металічны.

Карацей, рамонт усе грошы мае назбіраныя да капейкі пацягнуў. Затое кухня вялікая, светлая, вітальня шыкоўная і, галоўнае, пакой у Волечкі асобны. Ух, як яна радавалася! Стась ёй на першы час стол і шафу для кніг прывёз, не новыя (спісвалі недзе там у канторы). А ён падрамантаваў, пафарбаваў-палакіраваў — гэтак добра атрымалася. Вось дзе, думаю, будзе шчасце той Зіначцы — такія рукі ў мужчыны і характар добры: цвёрды, ды ж не ўпарты на дробязях.

Зіначку я пабачыла. Ну, праходзіла міма, выпадкова, можна сказаць. Ад пятак да макаўкі галавы — бы тая лялька. Мяне з ёй побач пастаў — баба разанская: бёдры зашырокія, росту няма, жывот пасля цяжарнасці надта расцягнуўся, грудзі невялікія. Параўнала, усміхнулася кісла.

Калі ў Стася пачалі атрымлівацца нескладаныя эцюды, папрасіў разам з ім пад'ехаць ды купіць скрыпку: «Хачу іграць на сваёй. Каб добрую, хай і дарагая будзе…» Купілі. Ён радуецца, бы дзіця, Волечка мая радуецца разам з ім. А мне не надта радасна. Сама разумееш, няма тут чаго тлумачыць. Гатую шчасце на чужы стол…

Стась займаўся старанна, чым далей — тым з большай ахвотай. Выконвае заданні, усміхаецца летуценна, а я думаю: вось, уяўляе, як будзе граць паланэз пад акном кабінета Зіначкі, як выйдзе яна расчуленая…

Снежань ішоў. Стась ужо ўпэўнена мог сыграць некалькі п'ес, амаль атрымліваўся і паланэз. І раптам за два тыдні да навагодніх святаў Стась пазваніў і сказаў: больш на ўрокі не прыйдзе. Ніколі. Блытана тлумачыў: усё — дзівацтва, не вартае мужчыны, бо жанчына не павінна нічога нікому, і ўвогуле, ён таксама нічога нікому не павінен, нельга атрымліваць каханне праз выйгрыш, бо жанчына — не рэч. І яму вельмі сорамна, і перада мной сорамна. І ўвогуле… Ён не хоча іграць для той жанчыны.

Мы ішлі з Волечкай дадому, яна радасна распавядала пра свае школьныя прыгоды, пра тое, якія прыгожыя сняжынкі вырабіла на ялінку, а ў маёй галаве бухала думка: ён не прыйдзе. Ён не хоча граць для той жанчыны…

Прыйшоў Новы год. Нават жаданы падарунак для Волечкі — новы тэлефон — не ўзняў ёй настрою. Ніколі раней не бачыла сваю дачушку такой сумнай.

Мінулі Каляды, я адважылася — пайшла да Стася на працу. Ён, як згледзеў, напалохаўся. Кажу яму:

— Стась, я грошы атрымала за студзень і люты. Я абавязана цябе давучыць. Другое: ты не сам-насам абяцаў паланэз — перад усімі. І ты павінен стрымаць сваё мужчынскае слова. Трэцяе: Волечка вельмі просіць цябе давесці да ладу ваш дуэт. У яе менавіта з табой атрымліваецца. Чацвёртае: калі ты не сыграеш, пачнуць гаварыць, што я ніякі настаўнік.

Іх дуэт Волечка прыдумала: сыграць паланэз скрыпка плюс цымбалы. Адшукала ноты патрэбныя — яны і развучвалі разам.

Стась глядзеў на мёрзлы асфальт, потым падняў вочы і ціха пытае:

— Вы лічыце, мне каля канторы ўсё ж неабходна сыграць? Як гэта трэба вам — я сыграю.

— Не трэба мне каля канторы, — уздыхнула я. — Праз якія два месяцы — ваша свята прафесійнае. Мы, як заўсёды, рыхтуем канцэрт. І ты выступіш. Калі не збаішся, канешне. І калі не хочаш выкінуць кату пад хвост мае ўрокі, растаптаць мае і Волечкіны адносіны да цябе.

Мабыць, менш за ўсё ён хацеў, каб я лічыла яго баязліўцам. Бо ажно здрыгануўся. А можа, ад іншага здрыгануўся.

— Добра, хадземце.

— Куды? — разгубілася я.

Мабыць, выгляд мела надта збянтэжаны, ажно Стась нечакана ўсміхнуўся, тварам пасвятлеў.

— Дык жа вучыцца…

І зноў пачаліся нашы ўрокі. Заўважыла: Волечка была стрыманая не па-дзіцячы, але пакрысе адтавала з кожным заняткам.

У нас заставалася два месяцы да канцэрта ў гонар свята камунальнікаў. Мая задумка, мабыць жа, была рызыкоўная і неразумная. Нельга так было рабіць. Бо ўсё магло сарвацца… Але ж, па шчырасці, выкананне Стася было не той якасці, каб ісці на вакальны нумар. А мне важна, каб ніхто не заўважыў ніводнай хібы. Хацелася свята для гэтага дзівака.

Калегі ідэю падтрымалі.

На канцэрт для Стася мы пазычылі ў народнага тэатра сапраўдны фрак. Канешне, ніхто, акрамя нас, пра яго дэбют не ведаў.

— Стась, я цябе папрашу, — кажу яму перад выхадам на сцэну і гляджу ў вочы літаральна з мальбой: — Ты павінен іграць, што б ні здарылася. Не спыняйся, не губляйся. Ноты перад табой і скрыпка — адзіна важнае.

І вось наш невялікі аркестр сыграў п'есу, пюпітры засталіся на сцэне, апошні нумар аб'яўляюць вядучыя:

— Паланэз Агінскага. Скрыпка. Выконвае слесар-сантэхнік камунальнай гаспадаркі Стась Кавальчук.

Залу як хваля землятрусу ўскалыхнула. Выбуховы гул — і цішыня насцярожаная, а ў той цішыні абцасы мякка застукалі — на сцэну выйшаў Стась. І зайграў.

Ён не пачуў лёгкіх крокаў Волечкі, не бачыў, як выходзіла яна праз паўхвіліны, адно пачуў гукі цымбалаў, якія далучыліся да мелодыі скрыпкі. Коратка азірнуўся і — разгублена, а пасля радасна заззяў усмешкай.

Потым на сцэну выйшла піяністка. Стась ужо не азіраўся, мне падалося, з гукамі піяніна ён стаў трошачку вышэйшы ростам.

Потым далучылася віяланчэль. І далей, па адным — увесь наш аркестр. Апошняй выйшла я — другая скрыпка на фінальную частку.

Прызнаюся табе: яшчэ ніколі на такім уздыме мы не іграли паланэз Агінскага, ніколі не гучаў ён у нас так хвалююча, узнёсла і святочна.

Зала ўзарвалася крыкам, зала стаяла і пляскала ў ладкі, зала гукала: «Брава! Стась!»

А ў мяне, дурніцы, цяклі і цяклі слёзы, я не бачыла нічога. Усё плыло перад вачыма, і толькі адно я адчувала: тое шчасце, такое шчасце, калі чуеш, як б'юцца сэрцы дарагіх табе людзей.

На вуліцы вецер хвастаў дажджом. Стась тупаў каля ўвахода, чакаў нас. Падышоў, зніякавелы, сарамлівы — такім са мной ён даўно не быў.

— Ірына, прабачце, калі скажу, што іграў паланэз для вас, паверыце?

Гляджу на яго, усміхаюся на ўвесь рот — вось жа дзівак!

— Паверу. Кажы мне «ты», хопіць ужо выкаць!

Ён носам шмыгнуў, капюшон курткі з галавы скінуў, выпрастаўся, усё адно як перад скачком у ваду, паветра ў грудзі набраў.

— Тады… Тады хачу цябе папрасіць. Не, хачу прапанаваць. Папрасіць… Ат, заблытаўся… Я вельмі хачу жыць разам з табой. І з Волечкай…

— А больш ад нас не пойдзеш? — строга спытала мая Волечка, даючы мне магчымасць уздыхнуць.

Да нас было не блізка, але мы не сталі выклікаць таксі. Ішлі праз мокры вецер, стылі і моклі. Так можна і надта доўга ісці, калі ведаеш: цябе чакае цёплы і ўтульны дом.

Сын Каржакаватай Рысі,

альбо Індзейскія сляды ў Беларусі

Наша цікавасць да «перакрыжаванняў» Беларусі з Новым Светам, Заходнім паўшар'ем спарадзіла мноства сюжэтаў для распрацоўкі, архіўных спраў, аналітычных матэрыялаў, доўгую перапіску, папкі выразак. Сабраны тысячы кніг, якія датычаць стасункаў. Працэс іх мэтанакіраванага назапашвання пачаўся з 1984 г., у XXI ст. велізарныя памеры набылі электронныя архівы. Інтэрнэт дазволіў дэталізаваць малавядомыя факты праз крыніцы, якія дагэтуль былі недасяжныя. Праца праходзіла галоўным чынам у рэжыме «незалежнага даследавання», аднак увесь час здавалася вартай дзяржаўнай увагі і падтрымкі. Часам нашы адкрыцці станавіліся важным дапаўненнем у энцыклапедыі і іншыя даведнікі.

З'яўленне ў інтэрнэце вялікіх масіваў алічбаванай перыёдыкі мінулых стагоддзяў дазваляе, напрыклад, дапоўніць гісторыю беларускай літаратуры біяграфічнай датай, якая адсутнічае і ў артыкуле ў «Беларускай энцыклапедыі». Генадзь Кісялёў, галоўны біёграф літаратара Юльяна Ляскоўскага, унесенага ў хрэстаматыю па беларускай літаратуры XIX ст.(1988), відаць, так і не даведаўся пра яго лёс пасля 1888 г. Не ведала гэтага ў 2016 г. і Вольга Лапацінская, складальнік вучэбна-метадычнага комплексу па літаратуры XIX ст. паслярэформеннага перыяду. Не трапілі ў іх поле зроку нават з дапамогай сеціва запісы з «некралогіі» газеты «Вольнэ польске слова» (Парыж) за 15 лютага 1889 г. і часопіса «Бібліятэка варшаўска» (Т. 1) пра нядаўнюю смерць пісьменніка, прычым часопіс удакладняў: памёр той у першых днях студзеня ў Вільні.

Такім чынам, гады яго жыцця могуць пазначацца 1826—1889. Апошняй яго кнігай стала аповесць з элементамі польска-беларускага вестэрна. Услед за Крысцінай Нарбут («У Амерыцы», 1875) і прыкладна адначасова з Марыяй Радзевіч (яе «Дзевайціс» і «Пажары і папялішчы» былі ўпершыню надрукаваны ў той жа год, што і кніга Юльяна) у мастацкай форме звярнуўся да тэмы крывавых канфліктаў паміж індзейцамі і пасяленцамі. Мэта аповесці Ляскоўскага «У Амерыку па золата» (Варшава, 1888, пад псеўданімам Марцін Мізэра) была найперш антыэміграцыйная.

Аўтар агляду кніжак для народа Мечыслаў Бжазінскі прыйшоў да высновы, што яна не заслугоўвае распаўсюджвання, назваўшы сярод хібаў тое, што, на яго думку, выглядала непраўдападобным, напрыклад, напад індзейцаў: «Становішча эмігрантаў, як падчас падарожжа, так і пасля іх прыбыцця на месца, прадстаўленае ў найгоршым святле: з гэтай мэтай, аднак, аўтар цалкам без патрэбы насылае на іх такія выключныя бедствы, як крушэнне судна, хваробу і страту родных, а ўрэшце напад дзікіх і пажар, што робіць увесь расказ малапраўдападобным» (Львоў, 1897).

Прозвішча Ляскоўскі сустракаем у яшчэ адным блізкім да нашай глебы індзейскім сюжэце — у публікацыі з газеты «Дзеннік Беластоцкі» за 1 красавіка 1926 г. На выбар прозвішча для галоўнага героя, метыса, якога, відавочна, «вымыслілі» прадстаўнікі санацыйнай журналістыкі, наўрад ці мог паўплываць ужо забыты ў Польшчы ў той час Юльян Ляскоўскі. Гэтая гісторыя поўная супярэчнасцей і крайнасцей. Да апошніх можна аднесці і тое, што ў выніку нападу на ферму «на граніцы Мексікі і Злучаных Штатаў», дзе жыла эмігрантка — настаўніца-полька Марыя, адбылося яе знаёмства з правадыром індзейцаў, які пасля стаў яе мужам. Ён быў клапатлівым сем'янінам, але калі на іх напалі белыя, ён забіў жонку, каб тая не дасталася ворагам. Тут мы маем справу з яўным парадыйным меладраматызмам.

Гаворыцца пра карную экспедыцыю супраць індзейцаў. Ян Ляскоўскі, сын правадыра індзейцаў па імені Каржакаватая (або Прысадзістая) Рысь (Krępy Ryś), у якасці палоннага трапіў у Нью-Ёрк, а пазней стаў добраахвотнікам у польска-савецкай вайне. Пасля заканчэння вайны стаў паважаным вайсковым асаднікам пад Баранавічамі; хоць быў метысам, нічога не гаворыцца пра тое, што ён быў чымсьці блізкі, у «індзейскай» частцы, карэннаму насельніцтву крэсаў.

Больш падрабязная версія 1932 г. газетнай гісторыі дапоўнена многімі не менш драматычнымі і дзіўнымі падрабязнасцямі. Напрыклад, што Яна ўзялі ў цырк, дзе ён выступаў у ролі «сына чырвонага правадыра», і гэта ўжо блізка да апавяданняў Генрыка Сянкевіча «Сахем» і «Орса», у якіх у цырку выступалі адпаведна сын правадыра, «спадчыннік» тытула і сын белага і індыянкі. Месца дзеяння загаловак пераносіць канкрэтна ў горы Мексікі, што робіць гэты вестэрн больш рэалістычным як частку аперацый супраць апачаў або малой «індзейскай» вайны часоў Панча Вільі.

Фота з сайта steklotorgopt.ru.

Менш ідыліі і ў сям'і Яна: ён забівае бацьку, пад апеку якога яго забралі ў Марыі, калі ўбачыў, што той забіў маці. Пры гэтым драма адносіцца да вайны паміж «Штатамі і Мексікай», калі «ўступіў атрад індзейцаў» (у тэксце 1926 г. гаворка ідзе пра «карную экспедыцыю», высланую ўрадам ЗША супраць племені перад Першай сусветнай вайной). Ужо позна для індзейскіх войнаў, але асобныя эксцэсы ўсё ж былі. Напрыклад, рэйды «адплаты» за «апачамі-рэнегатамі» — у падобнай сітуацыі ў 1896 г. у былога арызонскага шэрыфа Джона Слотэра з'явілася прыёмная дачка — апачка-немаўля Апачы Мэй.

Цікава, што гэтая падзея практычна адпавядае часу пераезду Марыі ў Амерыку, які даюць газеты ў 1926 г. Пра тое, што тэма ўдзелу індзейцаў у барацьбе з бальшавікамі і іншымі ворагамі Польшчы паднятая не толькі ў аповедзе, амаль у «сазе пра Ляскоўскіх», сведчаць сенсацыйныя, але скупыя і неправераныя звесткі пра Джэка Уілбэраў, якія з'явіліся ў інтэрнэце. Нібыта гэты індзеец уступіў у арміюГалера — у знак павагі да Касцюшкі — і загінуў у баях з немцамі ў Шампані.

SYN WODZA INDIAN
patrjotą i żołnierzem polskim
Z wigwamu —
NA PARCELĘ ŻOŁNIERSKĄ POD BARANOWICZAMI
Niezwykłe koleje życia Polaka amerykańskiego

Przed 30 laty wyjechała do Ameryki młoda Polka, panna Marja Laskowska, nauczycielka.

Emigrantka zamieszkała w farmie swego brata, położonej na granicy Meksyku i Stanów Zjednoczonych.

Pewnej nocy napadli na farmę czerwonoskórzy, wymordowali mieszkańców, a pannę Marję zabrał do swego namiotu wódz plemienia indyjskiego, Krępy Ryś.

Czerwony małżonek był dobry, tkliwy i przywiązany — więc młoda Polka, nie mając niikogo z rodziny na świecie, została w chatce i pogodziła się z swym losem.

W rok potem urodził się mieszańcowi indzeństwa syn, któremu matka nadała imię Jan.

Pani Marja wychowywała go [illegible] nauczyła języka polskiego [illegible], a gdy chłopak [illegible] na młodzieńca, ojciec go wprawiał w sztukę wojenną i przygotowywał do objęcia po sobie godności wodza Indyjskiego.

Na rok przed wybuchem wojny światowej wysłał rząd Stanów Zjednoczonych przeciw szczepowi indyjskiemu wyprawę karną.

Krępy Ryś stoczył z białemi twarzami okrutną bitwę. Widząc jednak, iż wszystko stracone, zamordował swą żonę, nie chcąc, by biała Misa dostała się w ręce wrogów, poczem rzucił się na oddział żołnierzy i legł przeszyty ich kulami.

Jan dostał się do niewoli i przybył jako jeniec do Nowego Jorku.

Tam zajął się nim jeden z Polaków, a gdy wybuchła wojna światowa, Jan wstąpił do wojska i odbył całą kampanję — ostatnio jako podoficer polski w walce z bolszewikami.

Pan Jan Laskowski, syn Krępego Rysia, wodza czerwonoskórych, gospodaruje obecnie na skromnej działce wojskowej w okolicach Baranowicz i cieszy się wielką powagą wśród sąsiadów nietylko jako nieustraszony żołnierz, lecz także ze względu na swe „królewskie" pochodzenie.

Выданне «Dziennik Białostocki», 1926.

Ці варта шукаць карані гэтых Ляскоўскіх, калі гісторыя выглядае як гумарэска, хоць і «патрыятычная», падобная да гумарыстычнага апавядання Сакрата Яновіча пра прыезд на Беласточчыну з мужам-беларусам індыянкі Даўганогай Лані? Так, бо ў герояў гэтага яўна мастацкага твора, які, з мадыфікацыяй, «не сыходзіў» са старонак польскіх газет не адзін год, могуць быць прататыпы, нават калі і не польскія. І як мінімум мае сэнс высвятляць асобу аўтара. З вялікай верагоднасцю ён быў звязаны з крэсамі і служыў справе іх умацавання. Магчыма, у апісаннях прыгод Яна Ляскоўскага мы сутыкаемся не проста з журналістам, які высмоктвае факты з пальца, а з пісьменнікам, чые сюжэты маглі паслужыць крыніцай ідэі для польскага містыфікатара Станіслава Суплатовіча (Сат-Ока), чыя маці нібыта стала жонкай індзейскага правадыра ў Канадзе. Да гэтага мы лічылі, што на Сат-Ока паўплываў найперш вядомы канадскі творца, брытанец Арчыбальд Белані (Шэрая Сава), які прысвоіў сабе ідэнтычнасць індзейца.

Для тых, хто жадае пазнаёміцца з польскімі арыгіналамі, прапануем назвы артыкулаў, якія дазваляюць знайсці іх у інтэрнэце. Вось чатыры вядомыя нам на гэты момант публікацыі: Syn wodza Indjan patrjotą i żołnierzem polskim. Z wigwamu — na parcelę żołnierską pod Baranowiczami. Niezwykłe koleje życia Polaka amerykańskiego (Dziennik Białostocki. 1926. 1 kwietnia. № 91. S. 3 — на здымку); Syn wodza Indjan patrjotą i żołnierzem polskim. Niezwykłe koleje życia Polaka amerykańskiego (Goniec Nadwiślański (Grudziądz). 1926. 7 kwietnia. № 79. S. 7); Polka żoną wodza Indjan. Burzliwa przeszłość polskiego żołnierza (Nowe Echo Białostockie. 1932. 22 kwietnia. № 110. S. 3); Polak — syn wodza Indjan. Z gór Meksyku na polskie Kresy (Nowy Kurjer (Poznań). 1932. 26 kwietnia. № 96. S. 10).

Індзеяністы-аматары, якіх стала асабліва шмат у 1970—1980-х гг. у сувязі з актывізацыяй руху індзейцаў, выбіралі для сябе асобныя плямёны, культурныя арэалы, у якія «паглыбляліся». Зразумела, яны шукалі прыклады, калі сяброўства і каханне, сямейныя вузы злучалі іх землякоў і індзейцаў. Наша цікавасць першапачаткова тычылася апачаў і Паўднёвага Захаду. Пазней стала відавочным, што найбольш перспектыўным з'яўляецца Ціхаакіянскае ўзбярэжжа, найперш Аляска і гістарычна звязаная з ёй Каліфорнія. І менавіта там мы знайшлі найбольш цікавыя прыклады ўзаемаадносін — ад шлюбаў да ўзброеных сутыкненняў — паміж выхадцамі з беларускіх губерняў і карэннымі народамі.

Апроч знаходак, якія аб'ядноўвае прозвішча Ляскоўскіх, 2018 г. прынёс і яшчэ адно важнае адкрыццё з гісторыі беларуска-індзейскіх сувязей. Высветлілася, што крэол Дзям'ян Саўчанка (просты чалавек, член «расшыранай» аляскінскай сям'і, пра якую знайшліся незвычайныя факты) у двух лістах 1890 і 1891 гг. з вострава Кадзьяк называе вучня царкоўнай школы ў Сан-Францыска Мікалая сваім сынам. Гэта адбываецца пасля смерці маці апошняга. Мікалай Саўчанка аказваецца сынам яго выхаванкі-тлінкіткі Аграфены, а не жонкі-тлінкіткі Марыі. Без гэтага ўдакладнення, за якое мы ўдзячны Кэтрын Арнт з бібліятэкі Універсітэта Аляскі, Дзям'яна, сына беларуса з Краснінскага павета Смаленскай губерні і, магчыма, крэолкі або алеуткі, пры прачытанні лістоў можна было пачаць лічыць заснавальнікам яшчэ аднаго «беларуска-індзейскага» роду.

Але і ў такім выглядзе гэта адзін з самых цікавых прыкладаў, што сведчыць аб існаванні сем'яў, у якіх аб'ядноўваюцца асобы беларускага і індзейскага паходжання. У брата Дзям'яна Паўла таксама была мажлівасць парадніцца з тлінкітамі. Памёр ён, меўшы каля 35 гадоў, у 1877 г. у горадзе Сітцы, пабудаваным на іх этнічнай тэрыторыі. У нас няма звестак, ці меў ён уласную сям'ю. Спіс беларуска-індзейскіх метысаў (з рознай прапорцыяй беларускай і індзейскай крыві) ёсць, ён не вялікі і не прадстаўлены славутасцямі (хаця пісалі пра беларускіх і індзейскіх продкаў музыкантаў Дэйва Брубека і Стыва Тайлера). Важна ставіцца да падобнага кшталту звестак асцярожна, бо многія вядомыя індзейцы і дзеячы з продкамі-індзейцамі — прадукт містыфікацыі, фальсіфікацый або домыслаў.

Масівы інфармацыі па беларуска-індзейскіх сувязях маюць мноства прыкладаў, якія ўражваюць і могуць быць крыніцай даследаванняў і адкрыццяў. Даведачныя матэрыялы, уключаючы генеральную картатэку і архіў рэдкага друку, маглі б выкарыстоўваць арганізацыі, што прадстаўляюць яшчэ мала развітыя школы беларускай амерыканістыкі, лацінаамерыканістыкі, індзеяністыкі.

Алесь СІМАКОЎ

Пісьменнікі краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў:

Мінскі парад — узор трываласці перад выпрабаваннямі

Парад, які прайшоў у Мінску, выклікаў самы шырокі розгалас і сярод творчай і навуковай інтэлігенцыі ў блізкіх да Беларусі краінах. Сваімі ўражаннямі пасля знаёмства са святочнымі мерапрыемствамі ў Мінску, якія пабачылі праз розныя крыніцы інфармацыі, дзеляцца пісьменнікі і вучоныя Расіі, Казахстана, Узбекістана, Туркменістана, Таджыкістана.

Валеры ТУРГАЙ, народны паэт Чувашыі (Чабаксары, Расійская Федэрацыя):

— Уражвае пазіцыя кіраўніцтва краіны, грамадскасці Беларусі. Вялікая Айчынная вайна — у сэрцах усіх беларусаў. Свята ў Мінску ў гонар Вялікай Перамогі стала святам для ўсяго свету! Я бачыў, што парад у Беларусі, на знаёмым і сімвалічным месцы, атрымаўся. Слава Беларусі і беларусам на ўсе адведзеныя чалавецтву часіны! Слава гораду-герою Мінску! А якая ў вас рота ганаровай варты! Усяму свету паказалі ўнікальны плац-канцэрт! А як годна ішлі на парадзе жанчыны-ваеннаслужачыя! Люблю бываць у вашай краіне. Люблю наведваць музеі і мясціны, дзе захоўваецца памяць пра гераічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны. І калі займаюся мастацкім перакладам, рыхтую публікацыі твораў беларускіх паэтаў на чувашскай мове, то ў мяне на рабочым стале бліжэй за ўсё ляжаць кнігі беларускіх паэтаў-франтавікоў Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Максіма Танка, Петруся Броўкі, Пятра Глебкі…

Рэнат ХАРЫС, народны паэт Татарстана, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі (Казань, Расійская Федэрацыя):

— У пярэдадзень Дня Вялікай Перамогі я ўспомніў мінскага падпольшчыка Івана Кабушкіна, які нарадзіўся ў Беларусі, а жыў у Казані. Кабушкіну прысвечаны помнік-трамвай, усталяваны ў нашым горадзе, на якім будучы герой і працаваў. Давайце памятаць пра такіх самаахвярных людзей — беларусаў, рускіх, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей. Дзякуючы ім мы святкуем Дзень Вялікай Перамогі.

У свой час я працаваў у Саюзе пісьменнікаў Татарстана поруч з Закі Нуры — вялікім паэтам. Яго творы выходзілі асобнай кнігай і па-беларуску. Дык вось, Закі Нуры быў камандзірам партызанскага атрада ў Беларусі. А пасля вызвалення Віцебшчыны ад фашыстаў працаваў старшынёй гарсавета ў Оршы. Хіба такую еднасць можна забыць?

Саліх ГУРТУЕЎ, народны паэт Кабардзіна-Балкарыі, ганаровы старшыня Клуба пісьменнікаў Каўказа (Нальчык, Расійская Федэрацыя):

— Рады і ганаруся парадам Перамогі, праведзеным у вашай краіне. З эмацыянальнай узрушанасцю ўспрыняў словы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пра вартасці нашай агульнай Перамогі, пра вартасці традыцый, пра актуальную і сёння барацьбу з нацызмам.

Падзеі Вялікай Айчыннай вайны ўсё далей ад нас. Але я і цяпер ведаю ўсіх ветэранаў, якія жывуць у Нальчыку, у маёй рэспубліцы, якія вызвалялі вашу рэспубліку ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тэма Беларусі ў судакрананні з Вялікай Айчыннай — святая для балкарцаў, кабардзінцаў. Мой старэйшы сябра, вялікі паэт XX стагоддзя Кайсын Куліеў, быў сябрам беларускіх паэтаў-франтавікоў — Аркадзя Куляшова і Пімена Панчанкі. Ганаруся гэтым і па меры сваіх сіл прадаўжаю ўмацоўваць дружбу нашай старонкі, нашых людзей з Беларуссю, беларусамі. Вы зноў паказалі, што ў Беларусі ёсць вышыні, якія яна ніколі не здасць. Бо ў вашай краіне ёсць мудры лідар.

Святлана Ананьева, літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук (Алматы, Казахстан):

— Мінск, як заўсёды, велічны ў сваім прыгожым, высокадухоўным стаўленні да мінулага. Адзій Шарыпаў, Сагінгалі Сяітаў — пісьменнікі, якія спрычыніліся да ваеннай памяці Беларусі сваімі лёсамі. Сотні сыноў Казахстана ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі за баі ў Беларусі — мы памятаем іх. Як і адрасы ў вашай краіне, якія далі вечны прытулак нашым землякам. І ведаем, што памяць пра казахстанцаў, якія аддалі свае жыцці за Мінск і Гродна, Брэст і Гомель, Віцебск і Магілёў, — у сэрцах і справах новых пакаленняў беларусаў. Нізкі паклон вам усім з Казахстана за памяць і за Парад Вялікай Памяці. Так і напішыце — з вялікай літары: Парад Вялікай Памяці…

Мікалай ЧАРКАШЫН, капітан I рангу ў адстаўцы, пісьменнік, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя В. Пікуля (Масква, Расійская Федэрацыя):

— Настрой 9 Мая мне стварыў і ўрачысты парад у Мінску. Бачыў, як дастойна святкуе Беларусь 75-годдзе Вялікай Перамогі. І хаця я дома ў ізаляцыі, працую за рабочым сталом, настрой прыўзняты і вельмі творчы. Пішу раман-дылогію, падзеі якога разгортваюцца і ў Першую сусветную, і ў Вялікую Айчынную на роднай мне Гродзеншчыне. Нарадзіўся я ў Ваўкавыску. Такая праца і ёсць мая Перамога, мой унёсак у памяць пра землякоў, пра бацьку, які ваяваў пад Віцебскам, быў узнагароджаны за подзвіг на беларускай зямлі.

І, канешне ж, вельмі хочацца ў Мінск, у Брэст, у Віцебск… Прыехаць і падысці да помнікаў, пакланіцца ім… Адчуць сувязь з пакаленнем пераможцаў.

Кучкор НАРКАБІЛ, пісьменнік, журналіст (Ташкент, Узбекістан):

— Мінск, Беларусь чарговы раз мяне ўразілі. Некаторы час таму гасцяваў у сталіцы Беларусі. Быў і ў музеі Вялікай Айчыннай вайны, і на плошчы каля Абеліска Перамогі прайшоўся па парку Перамогі. Мае развагі насілі і носяць канкрэтны характар: пішу мастацкі твор пра першыя дні Вялікай Айчыннай. Дзеля гэтага некалькі разоў прыязджаў у вашу краіну. Быў у Хатыні, адкрыў для сябе гісторыю спаленай фашыстамі пухавіцкай вёскі Беразянка. Многія старонкі маёй кнігі ўжо напісаны. А зараз пад уражаннем таго, што беларусы правялі ў знак 75-годдзя Вялікай Перамогі такі шчыры і такі адкрыты парад памяці, абавязкова яшчэ дапішу раздзел пра Мінск сённяшні, Мінск, які памятае і захоўвае традыцыі.

Ато ХАМДАМ, празаік, драматург, публіцыст (Душанбэ, Таджыкістан):



— Некалькі гадоў таму беларусы чарговы раз надрукавалі вершы народнага паэта Таджыкістана Саідалі Мамура пра Хатынь. Напісаныя ў 1970-я гады, гэтыя творы сучасныя і сёння. Вы, як аніякая іншая краіна, сучасныя ў захаванні памяці пра Вялікую Айчынную вайну. І сёлетні парад у гонар 75-годдзя Вялікай Перамогі ў Мінску пацвердзіў гэта! З Перамогай вас, беларусы!

Агагельды АЛАНАЗАРАЎ, празаік, паэт (Ашхабад, Туркменістан):



— У Беларусі выйшла тры мае кнігі на беларускай мове. Яны адрасаваны самаму юнаму чытачу. Ведаю, якія шчырыя і адкрытыя людзі беларусы. І маё знаёмства з тэлевізійным запісам ваеннага парада ў Мінску дало безліч станоўчых эмоцый. Адразу прыгадаў Героя Савецкага Саюза Івана Багданава, ашхабадца, які атрымаў гэтае званне за вызваленне Бабруйска, а пад Ваўкавыскам страціў руку. Менавіта пра Багданава аповесць беларускага пісьменніка і майго сябра Міколы Калінковіча «Возвращение рассветной раны». Мы яе выдалі ў Ашхабадзе па-туркменску і па-руску. Веру, што героя-ашхабадца згадаюць і ў Беларусі.

Запісаў Кастусь ЛАДУЦЬКА

Пад грыфам «сакрэтна»

Гістарычны прэзентаваў унікальны праект, прысвечаны ваеннай картаграфіі

У Беларусі да 75-годдзя Вялікай Пермогі падрыхтаваны розныя мерапрыемствы, якія адкрываюць шмат цікавых падрабязнасцей пра ваенныя дзеянні, герояў, сакрэтныя аперацыі. Адной з самых цікавых падзей апошняга часу стала адкрыццё выставачнага праекта «#Дакладнасць. Свет ваенных тапографаў», арганізаванага Нацыянанальным гістарычным музеем Беларусі сумесна з Дзяржаўным камітэтам па маёмасці і навігацыйна-тапаграфічным упраўленнем Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі.

Экспазіцыйны праект дае магчымасць убачыць гісторыю Вялікай Перамогі вачыма ваенных картографаў, тапографаў і геадэзістаў. Гэта даніна памяці і магчымасць данесці да шырокай грамадскасці каштоўнасць гераічнага ўнёску гэтых спецыялістаў у агульную Перамогу: на фронце карты прыраўноўваліся да баявой зброі.

Тапаграфічныя карты, з'яўляючыся ў тыя часы асноўнай крыніцай інфармацыі аб мясцовасці і адным з найважнейшых дакументаў у кіраванні войскамі, дапамагалі арміі ў гады Вялікай Айчыннай правільна арыентавацца на сушы, моры і ў паветры, паспяхова фарсіраваць водныя і іншыя перашкоды, дакладна браць у прыцэл гармат варожыя аб'екты.

— Многія ваенныя дзеянні пачынаюцца з вывучэння мясцовасці. Карта дае найбольш поўнае ўяўленне аб магчымасці структуравання абароны ці таго ж нападу, — упэўнены старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэй Гаеў. — Карта з'яўляецца адным з найважнейшых інструментаў кіравання войскамі. Унёсак ваенных тапографаў, геадэзістаў, картографаў у Вялікай Айчыннай вайне вельмі значны. Таму ў нас нарадзілася ідэя паказаць тое, з чым працавалі гэтыя спецыялісты, якой літаратурай і прыборамі карысталіся. Картаграфічныя фабрыкі, многія друкарні ў свой час былі пераарыентаваны на патрэбы ваеннай прамысловасці: працавалі з першага да апошняга дня вайны. Пра гэта сёння мала хто ведае і памятае, але мы вырашылі прачыніць дзверы ў гэтыя старонкі гісторыі.

Андрэй Анатольевіч даўно ўзначальвае Дзяржкамітэт па маёмасці. Яшчэ шчыльней ён звязаны з картамі: яго мама географ. Доўгі час захоўвала старыя планы мясцовасці, датаваныя 1939-м і 1944-м гадамі. Аб іх важнасці для сям'і кажа і надпіс алоўкам: «Нямецкія карты дзеда Андрэя». Напярэдадні адкрыцця выстаўкі гэтыя дакументы Андрэй Анатольевіч перадаў Нацыянальнаму гістарычнаму музею. За год да заканчэння вайны нацысты пачалі дзяліць шкуру незабітага мядзведзя. Беларусі як краіны, мяркуючы па карце, для іх ужо не існавала.

Выстаўка атрымалася ўнікальная. Аналагаў ёй у свеце яшчэ не было. У экспазіцыі сабрана каля 150 экспанатаў. Яны дэманструюць самыя розныя бакі дзейнасці профільнай катэгорыі спецыялістаў і адлюстроўваюць інфармацыю, якая выкарыстоўвалася войскамі. Цікавасць уяўляюць як матэрыялы ад савецкага боку, так і тыя, што выкарыстоўваліся нямецкімі войскамі ў арганізацыі баявых дзеянняў на тэрыторыі Савецкага Саюза.

Карта вызвалення Беларусі.

Арыгіналы фатаграфій і карт, прадстаўленыя на выстаўцы, да нядаўняга часу мелі грыф сакрэтнасці. Акрамя карт, у экспазіцыі можна ўбачыць геадэзічныя інструменты, такія як: кіпрэгелі, мензулы, нівеліры, тэадаліты, нівелірныя рэйкі. Гэтыя прыборы выкарыстоўваліся ў ваеннай тапаграфіі для палявых вымярэнняў, графічных баявых дакументаў.

— Мы вырашылі паказаць аспект ваеннай дзейнасці, пра які сёння практычна ніхто не ведае, — падкрэсліў дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі Павел Сапоцька. — Усе ведаюць пра геройскія подзвігі артылерыстаў, снайпераў, лётчыкаў, танкістаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. А чаму б не паказаць ролю картографаў, тапографаў і геадэзістаў у барацьбе з фашызмам менавіта праз прызму беларускай гісторыі. Гэты аспект мы вырашылі прадэманстраваць з дапамогай мемарыяльных рэчаў герояў вайны, абсталявання, унікальных карт. У нас атрымалася раскрыць тэму, падаць яе смачна і незвычайна. Праект унікальны тым, што 90 працэнтаў экспанатаў, якія цяпер дэманструюцца на выстаўцы, раней, акрамя спецыялістаў, ніхто не бачыў.

Знаходзячыся на лініі фронту, ваенныя тапографы і геадэзісты вырашалі задачы своечасовага тапагеадэзічнага забеспячэння ваенных дзеянняў: па матэрыялах аэрафотаздымкаў наносілі на карту ваенныя аб'екты праціўніка, рабілі фотадакументы, спецыяльныя карты і іншыя графічныя матэрыялы. Ваенныя тапографы і геадэзісты часцяком першымі прымалі на сябе варожы ўдар.

На выстаўцы прадстаўлены мемарыяльныя рэчы генерала арміі А. І. Антонава з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея, матэрыялы з архіва навігацыйна-тапаграфічнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл, якія раней не публікаваліся, планы мясцовасці з фондаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, сярод іх карта Клецкага і Нясвіжскага раёнаў, скапіраваная ў 1941 годзе падпольшчыкам Іванам Новікам (расстраляны ў студзені 1942-га), матэрыялы з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, што адкрываюць цікавыя старонкі гісторыі Беларускага штаба партызанскага руху, картаграфічныя матэрыялы з Дзяржаўнага цэнтра картографа-геадэзічных матэрыялаў і даных Рэспублікі Беларусь, прадметы з прыватных калекцый.

На выстаўцы таксама прадстаўлены ўнікальны атлас на нямецкай мове, дзе сабрана каля 50 карт аб стане спраў на ўсходніх землях на момант вайны. Да іх, дарэчы, адносілася і Беларусь. Нацысцкая армія рыхтавалася старанна. Вывучалі ўсё: ад клімату і дарог да прамысловасці і прыродных рэсурсаў. Асаблівую ўвагу надавалі тэкстыльнай вытворчасці і лясной гаспадарцы.

Выстаўка «#Дакладнасць. Свет ваенных тапографаў» адкрыта для наведвання ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь у пятніцу, суботу і нядзелю. Азнаёміцца з экспазіцыяй таксама можна і анлайн у фармаце 3D-тура па спасылцы ці скарыстаўшыся QR-кодамі, якія размешчаны на сайтах Нацыянальнага гістарычнага музея і Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі.

— Для таго, каб праект паказаць найбольшай колькасці людзей, мы з дапамогай прыватнай кампаніі «ФілТВ» вырашылі арганізаваць па выстаўцы віртуальны 3D-тур, — расказаў Андрэй Гаеў. — З дапамогай самых сучасных тэхналогій ёсць магчымасць пазнаёміцца з экспазіцыяй як комплексна, так і з кожным прадметам паасобку.

Вікторыя АСКЕРА,
фота аўтара

Аб'яднаныя трагедыяй

У Палацы мастацтваў прадставілі работы на ваенную тэматыку творцаў чатырох пакаленняў

Вялікая Айчынная вайна стала найвялікшай трагедыяй для беларускага народа і знайшла адлюстраванне ў творчасці шматлікіх мастакоў. Да ваеннай тэмы звярталіся прадстаўнікі бадай усіх жанраў, якія адлюстроўвалі розныя бакі жахлівых падзей. 8 мая ў Палацы мастацтваў адбылося адкрыццё маштабнай выстаўкі «75 гадоў Памяці». Праект унікальны тым, што ў палілог на тэму вайны ўступаюць адразу некалькі пакаленняў творцаў. Так, другі паверх галерэі цалкам аддадзены работам майстроў XX стагоддзя — рамантыка Леаніда Шчамялёва, манументаліста Аляксандра Кішчанкі, філосафа Мікалая Залознага, лірычнага Мая Данцыга і іншых легенд беларускага мастацтва — усяго 140 палотнаў. На першым паверсе трагічныя падзеі мінулага ў сваіх інсталяцыях і карцінах пераасэнсавалі сучасныя творцы.

Знамянальны юбілей — 75 гадоў з дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне — нагадвае пра падзеі і вынікі мінулага, пра гераічныя і трагічныя старонкі гісторыі Беларусі XX стагоддзя. Сёння ад пераможнага мая 1945 года нас аддзяляе вялікі адрэзак часу, і гэта дазваляе адлюстроўваць ваенную тэматыку без штампаў, патэтыкі і бравурных інтанацый. Праект сведчыць пра памяць — гістарычную, сямейную, асабістую. Менавіта памяць стала своеасаблівым рухавіком творчасці беларускіх мастакоў, якія тым ці іншым чынам мелі дачыненне да драматычных падзей вайны.

— Мы невыпадкова назвалі гэты праект «75 гадоў Памяці», бо памяць — вельмі своеасаблівая катэгорыя. 75 гадоў мы гартаем старонкі жахлівых падзей, 75 гадоў памятаем, — тлумачыць мастацтвазнаўца, адна з кураторaў выстаўкі Наталля Шаранговіч. — На прыкладзе прадстаўленых твораў мы можам прааналізаваць, як з гадамі мянялася стаўленне да тэмы вайны. Па-рознаму ўспрымалі вайну шасцідзясятнікі, больш прадумана ставіліся васьмідзясятнікі, ну і, канечне, абсалютна па-іншаму ўспрымае вайну сучаснае пакаленне. Але ж усе работы, усе некалькі пакаленняў у гэтым праекце аб'ядноўвае эмацыянальнае ўспрыманне трагедыі.

Значная частка экспазіцыі дэманструе работы з новага праекта Беларускага саюза мастакоў «Залатая калекцыя». Гэта больш чым 100 жывапісных палотнаў і графічных лістоў 1960—1990 гадоў, прысвечаных тэме вайны. Аўтары — В. Цвірка, Я. Зайцаў, І. Стасевіч, У. Стальмашонак, Г. Вашчанка, І. Басаў, М. Селяшчук і іншыя — выдатныя майстры савецкага і сучаснага айчыннага мастацтва. Маштабныя палотны гэтых мастакоў паказваюць успрыманне падзей вайны і лёсу яе звычайнымі ўдзельнікамі ў кантэксце канцэпцыі памяці як найважнейшага маральнага складніка.

— Выстаўка не проста паказвае старонкі памяці, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, але і дэманструе вялікія імёны нашай беларускай мастацкай школы, якой, дарэчы, у гэтым годзе спаўняецца 75 гадоў, — адзначыў на адкрыцці выстаўкі народны мастак Беларусі Уладзімір Тоўсцік. — Праект дэманструе грунтоўнасць падрыхтоўкі ў Акадэміі мастацтваў. У асноўным усе ўдзельнікі экспазіцыі — выпускнікі акадэміі альбо яе выкладчыкі. Цяпер вельмі складаны час, але ён дае магчымасць у жорсткіх рэаліях зберагчы тое, што дадзена нам легендарнымі асобамі.

Уладзімір Кожух «Аплакванне».

На выстаўцы — як хрэстаматыйныя творы, так і работы, вядомыя толькі спецыялістам. Ва ўсіх выразна адчуваецца асабістае ўспрыманне вайны. Нягледзячы на тагачасныя каноны і ўмовы, у карцінах нашых папярэднікаў гучыць жывы, шчыры голас жывапісу. Нават тыя мастакі, якія не ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях, прыйшлі ў творчасць у пасляваенны час, выраслі пад уражаннем бацькоўскіх гісторый, успрымалі вайну як частку ўласнага жыцця.

Вайна — гэта не толькі боль і смерць, кроў, выбухі снарадаў, пераможныя салюты. Вайна — гэта сапраўднае сяброўства, вернасць, гэта каханне, вострае адчуванне прыгажосці зямлі, якую трэба ратаваць ад ворагаў; гэта ўспаміны і разважанні. Выставачны праект «75 гадоў Памяці» не дае ацэнак падзеям ваеннага часу, а ён працягвае асэнсаванне вайны ў творах, паказвае эвалюцыю стаўлення да трагічных старонак гісторыі краіны мінулага стагоддзя.

Вікторыя АСКЕРА

Таемнае становіцца вядомым

«Ноч музеяў» упершыню пройдзе ў анлайн-фармаце

Прыцягненне ўвагі да мастацтва сёння не самая простая задача, і сучасныя музеі паступова авалодваюць рознымі спосабамі зацікаўлення наведвальнікаў. Але нават тыя, хто не знаходзіць часу на музеі ў паўсядзённым жыцці, абавязкова згадваюць пра іх напрыканцы мая падчас маштабнай міжнароднай акцыі «Ноч музеяў».

Сцэна са спектакля «Чарадзей». Фота з сайта nochmuzeev.by.

Акцыя бярэ пачатак яшчэ ў 1970-х, калі многія еўрапейскія музеі абвяшчалі бясплатныя дні наведванняў, а для тых, хто не паспяваў агледзець усю экспазіцыю, падаўжалі час працы. Першая ноч музеяў адбылася ў Берліне ў 1997 годзе: адміністрацыя горада вырашыла пускаць наведвальнікаў у музеі бясплатна і праводзіць экскурсіі ўсю ноч. У наступным годзе да акцыі далучыліся яшчэ 20 гарадоў Германіі. Сучасную назву міжнародная акцыя атрымала ў 2005 годзе — тады на ініцыятыву Францыі адгукнуліся музеі 47 краін свету.

«Ноч музеяў» ладзіцца пры падтрымцы Міжнароднага савета музеяў (ICOM) і Савета Еўропы. На афіцыйным сайце праекта абазначана яго мэта: «акцыя накіравана на прыцягненне наведвальнікаў, для якіх музей "так блізка і так далёка"». Рэкамендаваны фармат «Ночы музеяў» — бясплатны ўваход і час працы да гадзіны ночы, але кожны музей вольны сам устанавіць і цану квіткоў, і працягласць працы. Традыцыйна «Ноч музеяў» праходзіць 16 мая, а 18-га адзначаецца Міжнародны дзень музеяў. Многія ўстановы прымяркоўваюць свае мерапрыемствы да абодвух свят.

Беларусь далучылася да міжнароднай акцыі яшчэ ў 2005 годзе. Галоўным ініцыятарам стаў Нацыянальны мастацкі музей (у першую ноч акцыі яго наведала больш за 2000 чалавек). З кожным годам цікавасць да мерапрыемстваў «Ночы музеяў» і колькасць наведвальнікаў павялічваліся.

У мінулым 2019 годзе да акцыі далучыліся больш чым 90 удзельнікаў, сярод якіх — дзяржаўныя і прыватныя музеі з Мінска і іншых рэгіёнаў Беларусі, выставачныя пляцоўкі, забаўляльныя цэнтры і г. д.

У 2020 годзе на акцыі «Ноч музеяў», як і на ўсёй сферы культуры, мастацтва і забаўляльнага бізнесу, адбілася эпідэміялагічная абстаноўка. Не ўсе адважваюцца правесці маштабнае мерапрыемства, але менавіта такія абставіны становяцца нагодай для эксперыментаў з анлайн-фарматам. У Беларусі акцыя пройдзе ў такім фармаце ўпершыню.

Нацыянальны гістарычны музей супольна з відэасэрвісам *VOKA* правядзе трансляцыю музычнага спектакля «Чарадзей» 16 мая ў 21.00. Рок-фолк-опера «Чарадзей» створана кампазітарам Раманам Арловым, прэм'ера адбылася ў 2016 годзе ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Сюжэт абапіраецца на летапісныя крыніцы, персанажы — знакавыя постаці беларускай гісторыі і міфалогіі. Для анлайн-трансляцыі былі выбраны асобныя нумары са спектакля, якія прагучаць у акустычным фармаце.

Святкаванне Ночы музеяў працягнецца начным канцэртам, які будзе трансляцца з унутранага дворыка Нацыянальнага гістарычнага музея. Прамы эфір будзе даступны для прагляду з любога пункту свету праз сэрвіс *VOKA*.

Беларускі дзяржаўны музей архітэктуры і побыту не стаў выходзіць за межы звыклага фармату і запрашае наведвальнікаў на тэматычную экскурсію і музычную праграму. Асаблівасцямі праграмы стануць містычная экскурсія пры святле ліхтара па вечаровым музеі, начное вогнішча і магчымасць за дадатковую аплату здзейсніць палёт на дэльтаплане над тэрыторыяй музея. Святкаванне пачнецца ў 19.00 16 мая.

Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей далучыцца да міжнароднай акцыі 18 мая, але час працы пакідае звычайным — з 9.00 да 18.00. У межах святкавання запланавана правядзенне бліц-гульні «Пазл музейных падзей» у анлайн-фармаце. На афіцыйным сайце і ў сацыяльных сетках музея будзе трансліравацца рэтраспектыўнае відэа, сабранае з найбольш яскравых момантаў святкавання «Ночы музеяў» у Глыбокім. На працягу дня музей прапануе бясплатны ўваход для наведвальнікаў на асноўную экспазіцыю і тэматычную выстаўку, прысвечаную 75-годдзю Вялікай Перамогі, а таксама ўдзел у квэст-гульні. На момант напісання тэксту гэта адзіны рэгіянальны музей, які прадставіў сваю праграму на афіцыйным сайце «Ночы музеяў» у Беларусі.

Штогадовы флагман святкавання музейных свят — Нацыянальны мастацкі музей Беларусі — у гэтым годзе дазволіць сваім гледачам зазірнуць у музейнае закуліссе. 18 мая, у Міжнародны дзень музеяў, у 19.00 адбудзецца прамы эфір у сацыяльных сетках музея (*Facebook* і *YouTube*): супрацоўнікі правядуць гледачоў у фондасховішчы і рэстаўрацыйныя майстэрні — туды, куды звычайны наведвальнік ніколі не можа і не зможа трапіць.

Мінскі музей музыкі запрашае на анлайн-шпацыр 16 мая ў 22.00. У сацыяльных сетках музея адбудзецца экскурсія па музеі, музычная праграма і віктарына. Самы загадкавы пункт праграмы абяцае знаёмства з прывідам Музея музыкі.

Музей гісторыі беларускай літаратуры падрыхтаваў шырокую праграму мерапрыемстваў у сваіх сацыяльных сетках і на афіцыйным сайце, агульная назва якой — «Музей заўсёды побач». 16 мая ў 18.00 анлайн-наведвальнікаў чакаюць разнастайныя інтэрактыўныя гульні, апытанні, віктарыны, відэаматэрыялы. Музей зробіць экскурс у найбольш яскравыя моманты былых святкаванняў «Ночы музеяў», пазнаёміць са структурай свайго музейнага аб'яднання і прадэманструе супрацоўніцтва з іншымі ўстановамі. Акцэнт праграмы будзе зроблены на сёлетніх пісьменніках-юбілярах, напрыклад, з нагоды юбілею Уладзіміра Караткевіча музей падрыхтаваў інтэрактыўную карту па рамане «Каласы пад сярпом тваім».

Літаратурны музей Максіма Багдановіча да Міжнароднага дня музеяў падрыхтуе адмысловы анлайн-праект «Сакрэтныя матэрыялы» на аснове самых загадкавых экспанатаў музея. 18 мая ў сацыяльных сетках музейшчыкі будуць знаёміць наведвальнікаў з фондавымі экспанатамі, прызначэнне якіх чалавеку XXI стагоддзя ўжо амаль не зразумелае. Таксама ў межах акцыі супрацоўнікі музея падзеляцца вытрымкамі з унікальных фондавых дакументаў, якія дапамогуць па-новаму паглядзець на самага маладога класіка беларускай літаратуры і яго сям'ю.

Літаратурны музей Петруся Броўкі запрашае на відэаэкскурсіі (на *YouTube*-канале музея) па пастаяннай экспазіцыі, па доме на вуліцы Карла Маркса, 30 і мемарыяльных пакоях, па часовай выстаўцы «З місіяй — у падарожжа» ў 19.00 16 мая. У іншых сацыяльных сетках у 20.00 адбудуцца прэзентацыі калекцыі фондавых прадметаў «Калі не цяпер, то праз 100 гадоў», фотапраекта Дарыі Карчашкінай «Рукі музея» і выстаўкі пастэлі Вольгі Владыка «Музейная імпрэсія». Па папярэдняй рэгістрацыі ў 18.00 можна будзе трапіць на літаратурную сустрэчу «Беларускія літаратурныя экспрэсіяністы XX стагоддзя» з Васілём Дранько-Майсюком, якая пройдзе ў фармаце анлайн-канферэнцыі. Праграма будзе мець агульную назву «Дваічны код».

Нацыянальны літаратурны музей Янкі Купалы адзначыць музейнае свята 18 мая. У сацыяльных сетках і на афіцыйным сайце музея плануецца правядзенне віктарыны пад назвай «Я памятаю», прысвечанай самым яскравым момантам папярэдніх святкаванняў «Ночы музеяў». Будуць падведзены вынікі флэшмобу «Адпачні як...», у якім супрацоўнікі музея прапаноўваюць наведвальнікам паўтарыць фотаздымак Янкі Купалы. Рыхтуецца адмысловы відэаролік «З Купалам у сэрцы», які адлюструе любоў саміх супрацоўнікаў музея да сваёй справы. Каб выказаць падзяку сучасным дактарам і медыцынскім супрацоўнікам, музей плануе распавесці пра ўрачоў у жыцці Янкі Купалы. Таксама 18 мая запланавана віртуальнае адкрыццё выстаўкі «Сваякі», прысвечанай 100-годдзю Купалаўскага тэатра. У 20.00 адбудзецца анлайн-канцэрт Аляксандра Віслаўскага з праграмай «Тутэйшыя», а ў 23.00 музей прапануе ўнікальную магчымасць зазірнуць у свае фондасховішчы, паглядзець на найбольш цікавыя прадметы. Віртуальная экскурсія пройдзе пад назвай «Таямніцы Купалавага дому».

Не менш шырокая праграма ў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. На працягу дня 18 мая ў сацыяльных сетках і на афіцыйным сайце музея пройдзе марафон-віктарына «*Happy hour*»: кожную гадзіну будзе з'яўляцца новае пытанне-асацыяцыя, удзельнікам неабходна сабраць як мага больш правільных адказаў. Таксама ў праграме — гарадскі квэст (яго можна будзе прайсці анлайн — дасылаючы пункт геалакацыі, дзе схаваны ключы-падказкі да таямніцы), віртуальная экскурсія па актуальных выстаўках, відэаканферэнцыя (супрацоўнікі і сябры музея прачытаюць урыўкі з любімых твораў Коласа), інтэрнэт-квэст па залах музея, гульня «Адгадай твор Коласа па трох словах». Падчас святочнай праграмы будзе прадэманстравана серыя ролікаў да анлайн-выстаўкі «Дрыгва», відэафільм «Якуб Колас і прырода», сумесны праект з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры «Таямніца фондаў Песняра» да юбілею У. Караткевіча. Таксама прэзентуюць новы сайт музея. Напрыканцы святочнага дня — анлайн-праект «Сны Якуба Коласа» (відэа са спальнага пакоя Я. Коласа з дэманстрацыяй рэчаў інтэр'ера, якія звычайна схаваны ад вачэй наведвальнікаў) і анлайн-гульня па сумеснай выстаўцы музея Якуба Коласа і мастака Анатоля Бяляўскага.

Фота з сайта belarus.by.

Сёлета беларускія музеі на сваім прыкладзе прадэманструюць не толькі спосабы выхаду са складанага становішча, але і тое, як вымушаныя меры пераўтвараюцца ва ўнікальныя магчымасці. Анлайн-фармат дазваляе паказаць гледачам тыя месцы і сферы жыцця музеяў, у якія ніколі не будзе адкрыты доступ, дзе ніколі не пройдуць звычайныя экскурсіі, а таксама ў лаканічнай форме пазнаёміць са структурай і супрацоўнікамі музея.

Падрыхтавала Дар'я СМІРНОВА

Хрысціна ВЫСОЦКАЯ:

«Эксперыментатарам сябе назваць не магу»

Хрысціна Высоцкая — адна з самых вядомых прадстаўніц маладога пакалення творцаў, хто працуе ў кірунку мастацкага тэкстылю. Мастачка валодае рознымі тэхнікамі, разважае на філасофскія тэмы, да таго ж дзеліцца сваімі ведамі са студэнтамі Акадэміі мастацтваў, дзе выкладае ўжо некалькі гадоў. Пра тое, як у мастацкім тэкстылі адрозніваць сучасны падыход ад традыцыйнага і чаму насценны тэкстыль паступова трансфармаваўся ў аб'ёмны, Хрысціна Высоцкая расказала карэспандэнту «ЛіМа».

— Хрысціна, вас у Беларусі ведаюць як таленавітага аўтара, які працуе з мастацкім тэкстылем. Чаму менавіта гэты кірунак? Што прывабіла ў ім?

— Першапачаткова з тэкстылем звязваць сваё жыццё не планавала. У мяне заўсёды было шмат інтарэсаў, бацькі таксама стараліся займацца маім развіццём: я хадзіла ў школу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Займалася музыкай, керамікай, роспісам па дрэве, саломкай. Заўсёды ведала, што буду маляваць, шыць, але ніколі не думала, што гэтыя захапленні перарастуць у прафесію.

Напэўна, стаць мастаком — гэта была мара. З узростам я ўсё ж такі вырашыла яе рэалізоўваць, а не сядзець склаўшы рукі. Спачатку ўсё было абстрактна: не разумела, як і што рабіць, што для гэтага трэба. Мне ўвесь час хацелася знаходзіцца ў стане творчасці.

Не ўсе ўхвалялі мой выбар. Але ў адзінаццатым класе я ўсё ж такі вырашыла, што буду паступаць у Акадэмію мастацтваў. І гэтае рашэнне таксама было абстрактнае, бо я не мела сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў гэтай галіне. Хтосьці прыходзіць, напрыклад, са школы Ахрэмчыка і з самага пачатку разумее, што да чаго. А ў мяне разумення не было.

Калі выбірала кірунак, ведала, што не буду паступаць на мастацкі факультэт: планка вельмі высокая. А мая выкладчыца, у якой займалася ў школе дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, настройвала мяне на паступленне менавіта ў сваім кірунку. Я разумела, што керамікай займацца не хачу, прываблівала нешта новае. З тэкстылем раней не працавала, але з'явілася адчуванне, што будзе цікава. Мадэляванне таксама не цікавіла: не адчувала, што гэта маё. Усё круцілася вакол тэкстылю.

Пайшла на курсы ў акадэмію. Выкладаў у нас Павел Бондар — называю яго сваім першым настаўнікам па тэкстылі. Ён адразу выклікаў прыхільнасць да сябе. Некаторыя казалі, што я не змагу, а ён дапамог паверыць у свае здольнасці. І ўжо ведала, што, калі не атрымаецца з першага разу, абавязкова буду спрабаваць другі ці трэці. У выніку ўсё склалася — паступіла.

Калі пачалася вучоба, адчула, як мне падабаецца працаваць з тэкстылем, зразумела, наколькі гэта незвычайны кірунак. З кожным годам усё больш паглыбляюся ў свет тэкстылю, знаходжу новыя грані творчасці.

— У наш час жывапіс і скульптура больш папулярныя, чым тэкстыль. Але, калі глядзець глабальна, што, на ваш погляд, можа прыцягнуць: трансляцыя праблематыкі ці разважанне над вечнымі тэмамі?

— Цяпер праблему можна пратрансліраваць праз любы кірунак. Неабавязкова тэкстыль, кераміка або метал. Галоўнае — фантазія і асоба мастака, які і ўздымае пэўную праблему.

Мне ў тэкстылі вельмі падабаецца працаваць з колерам, фактурамі. У жывапісе не заўсёды можна дамагчыся такога маштабнага эфекту. Я, дарэчы, займаюся не толькі тэкстылем, люблю жывапіс, пішу акварэллю і алеем. Летам выбіраю час, калі алеем пішу шмат. Мне падабаецца пераключацца.

Тэкстыль у Беларусі як кірунак пакуль не надта папулярны. Але нам усё роўна ёсць, што паказаць. Канкурэнцыя не такая, як у той жа графіцы. Мне здаецца, ім часам у сваім свеце нават цеснавата. А ў тэкстылі ёсць вялікае поле, каб разгуляцца. Калі працягнем развівацца, кірунак стрэліць.

— У тэкстылі вы працуеце як у традыцыйнай, так і сучаснай тэхніцы. Раскажыце, у чым іх адрозненне?

— Традыцыйныя тэхнікі прадстаўлены ў нязменным выглядзе. Напрыклад, гладкатканы габелен, які ткуць у аднудзве ніткі. У палатно не ўводзяцца іншыя матэрыялы. Гэта класіка. А вось калі на рамізным станку закладваюцца ўзоры, гэта ўжо нетрадыцыйны падыход да традыцыйнага. Атрымліваецца баланс.

Я падтрымліваю гэты баланс. Сучасны тэкстыль у Заходняй Еўропе, Амерыцы ці Японіі — краінах, дзе ён развіты, вызначаюць як пэўную філасофію валакна, самога працэсу перапляцення. Напрыклад, нетэкстыльным лазерам на матэрыяле нешта выразаюць, а потым зверху вышываюць пластыкавай стужкай. Атрымліваецца, што праца быццам не звязана з тэкстылем, але карані мастацкай мовы такія ж. Часам аўтары трансліруюць пэўныя пазіцыі. Нядаўна на трыенале ў Польшчы я ўбачыла цікавую працу. Мясцовы аўтар паказала дыван з экашкла, на якім быў выразаны малюнак. Пліта атрымалася напаўпразрыстай, а пад ёй размясцілі пыл, змяшаны з пяском, абрэзкамі газет. Гэта метафара падзіванных гульняў. Мастак вельмі цікава абыграў задумку.

Сёння тэкстыль больш дапамагае зразумець філасофію мовы тканіны, але ўжо праз сучасны падыход, новыя матэрыялы. Мае скульптуры створаны з класічных матэрыялаў: ваўняная, баваўняная пража. Працуючы з такімі матэрыяламі, я раблю аб'ёмныя формы. Пакрыху ўводжу пластык, магнітныя стужкі. Але эксперыментатарам сябе назваць не магу.

Аб'ёмная скульптура з'яўляецца базісам для далейшага развіцця мастацкага тэкстылю. Ад функцыі ўбрання інтэр'ера тэкстыль паступова пераходзіць у катэгорыю выставачнага плана. Мне з формай працаваць прыемна і цікава. Калі прадумвала дыплом, захацелася, каб гэта была аб'ёмная скульптура.

Таксама падабаецца працаваць з колерам, сумяшчаць цёплае з халодным, падабаецца эфект гармоніі і дысбалансу. У маёй апошняй рабоце «Стварэнне Евы» знешняя агранка нябесна-блакітнага колеру, а ўнутры каралавая. Мне падабаецца рабіць скульптуры скразныя, каб чыталіся і ўнутраная, і знешняя часткі. Люблю гуляць з рознымі колерамі і фактурамі.

— А якія тэмы ў творчасці цікавыя найбольш?

— У маіх работах часта можна ўбачыць сінтэз мінулага і сучаснасці. Гэта асабістыя перажыванні, звязаныя з жыццёвым вопытам, вандраваннямі. Падабаецца пераасэнсоўваць тое, што было пражыта. Магчыма, гэта эгаістычны падыход, але ў ім шмат шчырасці. Тэмы ў мяне розныя, але вельмі люблю разважаць пра дзявочы лёс, шукаць эмоцыі.

Мяне натхняюць новыя гарады і архітэктура. Прыязджаеш, напрыклад, у Амстэрдам альбо Рым, а там нават паветра іншае. Хочацца гэта перадаць. А вось у тэкстыльных скульптурах развіваю больш філасофскія думкі, запазычаныя з кніг, напрыклад, бясконцасць Сусвету. У мінулым годзе шмат працавала над біблейскай тэматыкай.

— Ці можна сказаць, што школа дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў Беларусі дастаткова развітая? Якія настаўнікі паўплывалі на ваша станаўленне як мастака?

— Нашы аўтары вельмі прывязаныя да традыцыі. І гэта добра. Звычайна я кажу, што для аўтараў-тэкстыльшчыкаў традыцыя — вялікае энергетычнае поле. У нас да сённяшняга дня вельмі моцны манументальны габелен, каля вытокаў якога ў нашай краіне стаяў Аляксандр Кішчанка. А работы сучасных аўтараў — водгалас таго перыяду. У нас папулярны гладкі габелен, але ўжо як арт-аб'ект. Зараз гэта не посцілка для ложка, а экспанат для выставачных прастор.

Часам мне здаецца, што тэкстыльны кірунак у Беларусі знаходзіцца ў статычным стане. Не магу назваць гэта застоем, проста ёсць адчуванне, што ў нашай справе была праведзена нябачная рыса, за якую нельга выходзіць.

У Беларусі некалькі школ мастацкага тэкстылю. У адкрытую пра гэта ніхто не заяўляе, але такая сітуацыя існуе. Ёсць школы Акадэміі мастацтваў, Інстытута культуры, Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта. У кожнай з іх падыход да тэкстылю розны. Тое, што робім мы ў акадэміі, рухаецца ў кірунку эксперымента, пошуку іншых моў праз матэрыял. У Інстытуце культуры больш прывязваюцца да традыцыі і працягу культурных напрацовак. У Віцебску адукацыйны працэс накіраваны на мікс традыцыйнага і сучаснага. Там шмат эксперыментуюць, але адразу ж заўважна, што іх школа на тую ж школу Акадэміі мастацтваў не падобная: яны больш працуюць з фактурамі, паверхняй палатна, займаюцца аплікацыямі.

Як я ўжо казала, на маё станаўленне ў тэкстылі паўплываў Павел Бондар. Гэта быў першы чалавек, з якім я пачала працаваць у акадэміі. Усе чатыры гады выкладання ён натхняў. Адна справа — калі ты ўжо разумееш, як трэба працаваць, у якім кірунку, іншая — калі для цябе ўсё новае. Ён нам з першага курса гаварыў пра эксперымент, што трэба спрабаваць сумяшчаць матэрыялы, не баяцца думаць нестандартна.

Таксама я вельмі ўдзячная Маргарыце Шчамялёвай. Яна шмат дапамагла зразумець у колеры, пошуку глыбіні ў матэрыяле. На сваіх занятках заўсёды вучыла развіваць ідэю. Бывала, прынясеш ёй эскізы, а яна толькі з чацвёртага разу іх прыме, калі дапрацуеш.

Зрабіла ў маё прафесійнае развіццё свой унёсак і мастацтвазнаўца Ларыса Фінкельштэйн. Я з другога курса дапамагала ёй з тэкстыльнымі пленэрамі і сама ў іх удзельнічала. Дзякуючы ёй паглядзела, як працуе выставачная кухня, як збіраецца экспазіцыя. Калі скончыла акадэмію і пачала працаваць на кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, на мяне адразу ж усклалі абавязак курыраваць выстаўкі кафедры. І вопыт, набыты ў сумеснай рабоце з Ларысай Давідаўнай, вельмі прыдаўся.

— Што, на ваш погляд, сёння больш перспектыўна: быць свабодным мастаком ці знаходзіцца ў прафесійным асяродку, выкладаць? Як вы самі сталі выкладчыцай?

— Складана адказаць на гэтае пытанне, таму што вольным мастаком я пакуль не была. У акадэміі пачала выкладаць па размеркаванні. Спачатку працавала, таму што трэба было, а потым спадабалася. Першы год даводзілася цяжка: курсы, у якіх я вяла, памяталі мяне яшчэ студэнткай — стаўленне было не самае добразычлівае. Усе ж мастакі, усе з амбіцыямі. А потым я сябе зарэкамендавала і больш не сутыкалася з шаблонным успрыманнем. У працы са студэнтамі падабаецца не ставіць сябе над імі, а ўспрымаць як калег.

— Ці ёсць у вас пэўная стратэгія выкладання?

— Я чалавек імправізацыі. Заўсёды кіруюся абставінамі. Звычайна стараюся выклікаць прыхільнасць да сябе, каб працавалася камфортна. У працэсе мне цікава праводзіць са студэнтамі мазгавыя штурмы, дапамагаць ім прымаць рашэнні. Стратэгіі як такой няма. Але ёсць пазіцыя: падчас працы абмяркоўваць у групе ідэі адкрыта. Вельмі не люблю, калі ў калектыве пануе атмасфера жорсткай канкурэнцыі, нядобразычлівасці. Таму заўсёды імкнуся ўзаемадзейнічаць са студэнтамі адкрыта.

— Ці ёсць сёння цікавасць у абітурыентаў да мастацкага тэкстылю?

— Цікавасць больш заключаецца ў магчымасці пераходу ад арт-аб'екта ў дызайн. Калі я вучылася, мы аддавалі перавагу мастацкасці. Апошнім часам у праграму пачалі ўводзіць больш дызайнерскіх пазіцый: тыя ж арнаменты, праца ў камп'ютарных праграмах. Гэта сёння запатрабавана.

Тэкстыль можна аднесці як да арт-аб'ектаў у інтэр'еры, так і да дызайну таго ж інтэр'еру, адзення. Шмат мікранапрамкаў, таму трэба навучыцца выбіраць сваю нішу. Мы, выкладчыкі, сваім студэнтам гэтыя напрамкі паказваем і дапамагаем вызначыцца.

Вікторыя АСКЕРА,
фота аўтара

Пра добрае і вечнае

Якую беларускую анімацыю варта паказаць дзецям?

Стварэнне аднаго анімацыйнага фільма ў любой тэхніцы — гэта тытанічная праца. У кожнай секундзе маляванага мультфільма 25 кадраў, гэта значыць, для дзесяціхвіліннай карціны трэба пятнаццаць тысяч малюнкаў. Штогод на студыі «Беларусьфільм» здымаецца ад 7 да 10 анімацыйных фільмаў. Акрамя гэтага, нельга здымаць з рахункаў незалежную беларускую анімацыю. Аднак у паветры павісла пытанне без адказу: чаму айчынныя анімацыйныя работы малавядомыя юным гледачам? Каб крыху выправіць сітуацыю, мы склалі спіс беларускай анімацыі XXI стагоддзя для бацькоў, якія рады паказаць дзецям айчынныя мультфільмы, але не ведаюць, як і дзе іх шукаць.

Для дашкалят

Першае, чым раім парадаваць дзяцей, — мультыплікацыйны серыял **«Рыбка па імені Нельга»** ад сцэнарыста і рэжысёра Аляксандра Ленкіна. У сямействе залатых карасёў з'явілася некалькі дзясяткаў малых, і на працягу васьмі серый бацькі выхоўваюць сваіх гарэз, паралельна навучаючы простым жыццёвым прынцыпам гледачоў серыяла. У мультфільме бацькі гіпербалізавана часта кажуць «нельга». Пасля прагляду дзіця будзе дакладна ведаць, што «можна», а што «нельга». Дарэчы, існуюць паштовыя маркі з кадрам з фільма «Рыбка па імені Нельга», якія былі выпушчаны да 40-годдзя беларускага анімацыйнага кіно.

Кінарэжысёр і мастак-пастаноўшчык Таццяна Жыткоўская з камандай прафесіяналаў з 2011 па 2013 год стварылі цыкл анімацыйных фільмаў **«Пра дзяўчынку Жэню»**. Гэта серыял, які складаецца з пяці частак, пра будні і свята маленькай дзяўчынкі, якая жыве ў вялікай сям'і, ходзіць у дзіцячы садок, пазнае свет і вучыцца ладзіць з бацькамі, выхавальніцай, старэйшай сястрой. З кожнай сваёй прыгоды Жэня атрымлівае жыццёвы ўрок, які ў даступнай форме агучвае. Так, у адным з эпізодаў дзяўчынка разумее, што сяброўства даражэйшае за самыя каштоўныя матэрыяльныя рэчы. Думаецца, гэты наратыў зусім не новы, але Джэром Сэлінджэр пісаў: «Лепш бы некаторыя рэчы не мяняліся. Добра, калі б іх можна было паставіць у зашклёную вітрыну і не чапаць».

Наступная рэкамендацыя — анімацыйны фільм **«Незвычайны дзіцячы сад»**, які складаецца з чатырох гісторый: «Худая Маша», «Як Кавардак у дзіцячым садзе пасяліўся», «Што здарылася з Борам», «Непаслухмяныя зашпількі». Героямі гэтых эпізодаў з'яўляюцца персанажы вершаў дзіцячага пісьменніка Андрэя Смятаніна. Рэжысёры-пастаноўшчыкі мультфільма — Марына Лук'янава і Руслан Сінкевіч.

Працягваем наш спіс яшчэ адной цікавай работай рэжысёра Руслана Сінкевіча — беларускамоўным фільмам **«Якія сны сніць мядзведзь»**. У аснову сюжэта пакладзены старажытны беларускі народны абрад — Камаедзіца. Яго сутнасць заключаецца ў сустрэчы вясны і цесна звязана з абуджэннем мядзведзя. У мультфільме людзі ўсёй вёскай будзілі ў берлагу мядзведзя, які скраў з неба сонца і тым самым затрымаў прыход вясны.

«Сараканожка» — яркая і мілая стужка Таццяны Кубліцкай пра сараканожку, якая страціла свае ножкі ад няўмення лічыць. Раз, два, тры, чатыры, пяць — і ваша дзіця можа навучыцца лічыць падчас прагляду гэтага мультфільма.

Калі вы ўжо пачынаеце вучыць з дзіцём алфавіт і шукаеце займальную форму для навучання, то некаторыя мультфільмы стануць выдатным «рэпетытарам». **«Анімакулі. Азбука ў вершах»** з дапамогай прыкладаў і выдатнай падачы дапаможа дзіцяці лепш запомніць літары рускага алфавіта. Кожная серыя прысвечана адной літары. Для жадаючых вучыць беларускую таксама ёсць анімацыйная прапанова з назвай **«Вясёлыя літары»**. Маленькім гледачам будзе цікава не проста запамінаць літары беларускай мовы, але і паглядзець займальныя гісторыі, у якіх тыя ўдзельнічаюць. Фільм складаецца з кароткіх сюжэтаў працягласцю ў паўтары хвіліны: ад літары «І» да «Р». Дзякуючы кароткім гісторыям, дзеці даведаюцца, як выглядаюць, пішуцца і вымаўляюцца літары беларускага алфавіта, якія словы з іх пачынаюцца, у якіх выкарыстоўваюцца.

На аснове казак

Хто ж з нас у дзяцінстве не любіў слухаць казкі? Нядзіўна, што анімацыйныя фільмы, у аснову якіх леглі казкі, трывала занялі асобную нішу ў калекцыі беларускай анімацыі. Яны разлічаны на дзяцей розных узростаў, таму чытайце і выбірайце, што падыдзе вашаму дзіцяці.

Пачнём гэты спіс адразу з двух анімацыйных фільмаў рэжысёра Таццяны Кубліцкай. Першы створаны паводле казкі беларускага пісьменніка Леаніда Улашчанкі. Цікавая анімацыйная работа пад назвай **«Песня Жаўрука»**. Птушаня спрабуе знайсці сваю песню і сустракае шмат іншых птушак з асаблівымі галасамі. Арнітолагам адразу пасля прагляду гэтага фільма ваша дзіця наўрад ці стане, але, можа быць, некаторыя назвы птушак у памяці замацуюцца. У аснову сюжэта фільма **«Піліпка»** пакладзена беларуская народная казка пра маленькага хлопчыка, які сваёй дабрынёй здолеў змякчыць суровае сэрца Бабы Ягі. «Піліпка» неаднаразова заваёўваў званне найлепшага фільма для дзяцей на кінафестывалях у розных краінах. Стужка — павучальная гісторыя пра спачуванне, а чырвонай ніткай усяго наратыву праходзіць залатое правіла маральнасці, якое абвяшчае: стаўся да людзей так, як хочаш, каб ставіліся да цябе.

Наступная анімацыйная работа, якую хацелася б параіць, створана на аснове беларускай народнай казкі рэжысёрам Аляксандрам Ленкіным. Называецца **«Дзед»**. Гэты беларускамоўны фільм з фрагментамі народных песень будзе цікавы не толькі дзецям. «Дзед» — добрая сямейная гісторыя, якая прыцягвае ўвагу сваёй анімацыяй.

На чарзе — некалькі анімацыйных работ Уладзіміра Пяткевіча. «Сустрэліся неяк ліса і журавель», — напэўна, так пачыналі распавядаць гэтую казку ў народзе, а таму і анімацыйны фільм **«Ліса і журавель»** пачынаецца з гэтага. Не будзем спойлерыць — самі паглядзіце, што адбывалася далей. Другі мультфільм гэтага рэжысёра па матывах казкі Д. Маміна-Сібірака называецца **«Жыла-была апошняя Мушка»**. Па назве можа падацца, што атрымаўся анімацыйны апакаліпсіс, але запэўніваем: гэта не так. Перад вамі паўстане толькі гісторыя жыцця адной мухі.

«Жылі-былі стары і старая. І была ў іх курачка Раба» — здаецца, што гэтая народная казка старая як свет, а таму, вядома ж, заслугоўвае беларускай анімацыйнай версіі, якую і стварыў Уладзімір Пяткевіч з аднайменнай назвай **«Курачка Раба»**.

Спіс анімацыйных фільмаў, створаных на аснове казак, быў бы няпоўны без работ па матывах твораў братоў Грым, якія бываюць досыць незвычайныя, а таму і анімацыйныя фільмы па іх лепш паказваць дзецям сярэдняга школьнага ўзросту. **«Беласнежка і Алацвецік»** — гісторыя пра маладога каралевіча, якога лясны гном з-за непачцівасці ператварыў у мядзведзя. І давялося б яму ўсё жыццё бадзяцца па лясах у мядзведжай скуры, калі б не Беласнежка, якая разгледзела ў нязграбным зверы чалавечую істоту. Наступны анімацыйны фільм **«Гусятніца ля калодзежа»** можа падацца змрочным, аднак канцоўка шчаслівая, а ўсе сюжэтныя павароты стануць зразумелыя і апраўданыя.

Фільм «Прыгоды Несцеркі».

Адукацыйныя

У гэтай катэгорыі мы аб'ядналі найлепшыя мультфільмы, якія, акрамя функцыі забаўляльнай, выконваюць яшчэ і адукацыйную. Такія анімацыйныя фільмы смела можна паказваць у школе.

Серыя фільмаў **«Казкі старога піяніна»** — праект, які знаёміць з біяграфіяй і творчасцю вялікіх кампазітараў. Праект транснацыянальны, а таму некаторыя фільмы цыкла здымаліся ў Англіі, ЗША і Расіі. У Беларусі над ім працавалі Алена Пяткевіч, Уладзімір Пяткевіч, Юлія Цітова, Ірына Кадзюкова. Цыкл фільмаў «Казкі старога піяніна» французскі Луўр уключыў у дзіцячую праграму. Ці не варта было б гэтыя фільмы паказваць і ў нашых музычных школах?

Чаму Ціхі, Атлантычны, Індыйскі і Паўночны Ледавіты акіяны называюцца менавіта так? Адказы на гэтае пытанне рэжысёр Ігар Волчак у займальнай форме даў у фільме **«Акіяны»**.

Альманах **«Аповесць мінулых гадоў»** — серыя гісторыка-пазнавальных анімацыйных фільмаў пра ўзнікненне гербаў беларускіх гарадоў. Аўтар ідэі і мастацкі кіраўнік — Ігар Волчак. Мультфільмы зняты ў змяшанай тэхніцы.

Апошні «лот» у гэтай катэгорыі: **«Беларускія Прымаўкі»**. Яны былі створаны ў 2008 годзе рэжысёрам Міхаілам Тумелем, а ў 2011 годзе выйшла другая частка. Гэта папуры з кароценькіх гісторый, якія з гумарам ілюструюць беларускія прымаўкі. За аснову графікі мультфільма ўзята беларуская выцінанка.

Забаўляльныя

Не заўсёды ж дзецям вучыцца ды вучыцца! Трэба і адпачываць.

Першае, што дакладна зацікавіць, — **«Прыгоды Несцеркі»** ад рэжысёра Ігара Волчака. Гэта восем смешных гісторый, у якіх папулярны герой народных легенд і паданняў Несцерка са сваімі неразлучнымі сябрамі сабакам і катом трапляюць у забаўныя сітуацыі і па-майстэрску знаходзяць з іх выхад.

Для аматараў фантастыкі ў нас дзве прапановы. Першая: анімацыйны фільм **«Пра сяброўства Шарыка і лятальную талерку»** рэжысёра Аляксандра Ленкіна. Там і пра іншапланецян, і пра лятальную талерку, але самае галоўнае — пра сяброўства! Другая прапанова: серыял **«Робікі»** вытворчасці анімацыйнай студыі *CubinCup*. У цэнтры сюжэта — робаты з чалавечымі характарамі. У гэтым анімацыйным серыяле няма неіснуючых істот, затое ёсць робасабакі і робаптушкі, а таксама робарасліны. Пры гэтым, як і ў жыцці, няма абсалютна злых або выключна добрых персанажаў. Серыял створаны з дапамогай камп'ютарнай анімацыі, а таму будзе больш звыклы для сучаснага дзіцяці, чым усе маляваныя фільмы, якія мы раілі раней (што не робіць іх горшымі, яны проста розныя).

Апошняя парада ў гэтай катэгорыі. Ужо знаёмы рэжысёр Аляксандр Ленкін зрабіў анімацыйны серыял аб прыгодах парасяці і яго сяброў пад назвай **«Рэактыўнае парася»**. Добрая і мілая анімацыйная работа стылістыкай нагадвае савецкія мультфільмы.

Для дзяцей старэйшага школьнага ўзросту

Фільм Ірыны Кадзюковай **«Легенда пра лэдзі Гадзіву»** заснаваны на старадаўняй англійскай легендзе, якая апавядае пра адважны ўчынак лэдзі Гадзівы ў пачатку XI стагоддзя. Выконваючы зневажальныя ўмовы мужа, старшыні ў парламенце горада Кавентры, яна праехала па горадзе аголенай і тым самым прымусіла парламент адмяніць указ аб увядзенні новых падаткаў.

У незвычайнай тэхніцы з выразанымі на паперы контурамі, падобнымі на навагоднія сняжынкі, створаны мультфільм Міхаіла Тумеля **«Выцінанка-выразанка»**. Пра што фільм? Пад песні беларускага этнагурта «Троіца» просты вясковы хлопец шукае сваё шчасце. Так проста, але вельмі цікава.

У Беларусі няма масавай вытворчасці анімацыйнага кіно — гэта факт, які даўно трэба прыняць, але ў нас ствараюцца цудоўныя кароткаметражныя работы пра «добрае і вечнае». Акрамя таго, усё больш увагі надаецца нацыянальным матывам, беларускай мове, культуры і гісторыі. Аніматары мадэрнізуюць міфалогію і фальклор, выкарыстоўваючы ў стужках сучасныя вобразы. З'яўляюцца экранізацыі народных казак, легенд і баек. Большая частка мультфільмаў працягвае ляжаць на паліцы кінастудыі «Беларусьфільм», але ёсць крыху анімацыйных гісторый, якія размешчаны на *YouTube* ў вольным доступе і чакаюць свайго гледача. Таму сёння справа за бацькамі: паказваць сваім дзецям беларускія анімацыйныя фільмы альбо не.

Наталля ВАВІЛОНСКАЯ



Фільм «Пра дзяўчынку Жэню».

Вынікі

Не расчаравацца ў тым, што робіш

Нічога не павінна заставацца па-за ўвагай пісьменніка. Ён павінен быць праўдзівым да ўсіх абставін жыцця. Гэтага меркавання прытрымліваецца Віктар Праўдзін, які днямі адзначыў юбілей — 65 гадоў. Да ўвагі чытачоў «ЛіМа» — аўтарскія развагі пра жыццё і літаратуру.

Сцяжынамі ўнутранага свету

Напэўна, няма нікога, хто б ні адчуваў пэўных змен унутры сябе, а тады і свет бачыцца па-іншаму. Чым даўжэй чалавек жыве на гэтым свеце, тым больш ён мае магчымасцей параўнаць, што было і 30, і 40, і 50 гадоў таму, з цяперашнім часам. Часткова гэтыя душэўныя змены адбіваюцца на выбары тэм, хоць у сапраўдным творы ёсць усё, незалежна ад тэмы.

У кожнага свая філасофія, якая абумоўліваецца выхаваннем у сям'і, адукацыяй і жыццёвым шляхам. Малады творца мае магчымасць фантазіраваць. Ён яшчэ не пажыў, не прайшоў нейкіх сцежак, і цудоўна: усё ў свой час. У мяне ж ёсць магчымасць абапірацца на досвед, бо за плячыма — служба ў марфлоце і праца ў праваахоўных органах. Маладым матросам на караблі не па сваёй віне я ледзь не страціў жыццё. Менавіта тады зразумеў, што ад выпадку залежыць усё наша існаванне. Наша пакаленне перажыло 90-я гады, калі кожны наўпрост ратаваў сваю сям'ю, а ў мяне яна была вялікая. Таму пішу толькі пра тое, што адбывалася насамрэч, і ніколі не прайду міма той тэмы, якая зачапіла за жывое.

Увесь мой унутраны свет — у творах. Калі казаць пра падзеі, якія не могуць не хваляваць, — гэта Вялікая Айчынная вайна. Калі ў свой час мне прапанавалі напісаць пра яе твор, гэта стала нечаканасцю. Бо нарадзіўся я праз дзесяцігоддзе пасля вайны (а пра вайну пісалі толькі тыя, хто яе прайшоў). Вядома, потым былі дзеці вайны, якія знаёмілі са сваім бачаннем… Але ў выніку я так спрычыніўся да гэтай тэмы, што напісаў, як мне падаецца, адзін з найлепшых сваіх твораў — апавяданне «Пяць цукерак ад Фрыца», у якім адлюстраваў тое, што перажылі мая маці, мае цёткі, мая бабуля.

Бачыць і адчуваць

Я вясковец, ужо колькі гадоў жыву на лецішчы, таму ведаю ўсе акалічнасці мінулага і сучаснага жыцця вёскі. Атрымалася напісаць раман «Парыж, Эйфелева вежа і два працэнты» — мой погляд на вёску, асабістыя адчуванні і параўнанні з мінулым. Ёсць у творы моманты, нацэленыя на захаванне вёсак і людзей у іх. Бо пісьменнік павінен не толькі адлюстроўваць рэчаіснасць, але і прапаноўваць, як выходзіць з сітуацыі.

Зараз праблема надрукаваць раман. З-за вялікага аб'ёму часопісы згаджаюцца толькі на публікацыю ўрыўкаў, на што я пайсці не магу. Усцешна, што ёсць дамоўленасць з выдавецтвам. Дарэчы, пасля кожнага выдадзенага твора тэлефануюць збольшага незнаёмыя людзі, каб спытацца, навошта пра іх напісаў. Звычайна гэта тыя, хто пазнае ў героях свае не самыя прыемныя рысы.

Для пісьменніка важна не расчаравацца ў тым, што робіш. У мяне таксама такое здаралася. Напрыклад, у сярэдзіне 1980-х мяне два гады не друкавалі ў «Маладосці»: Уладзімір Дамашэвіч, мой настаўнік, які цягнуў з мяне літаратурную апрацоўку, калі я, малады, прыходзіў з сюжэтамі і тэмамі, лічыў мой твор жорсткім, прасіў змякчыць. Але апавяданне адлюстроўвала рэчаіснасць таго перыяду. Жыццё больш жорсткае за твор самага бязлітаснага раманіста. Аўтара, які бачыць жыццё выключна ў адным колеры, чытаць не будуць.

Мая ж асноўная задача — жыць так, каб дзецям і ўнукам не было сорамна, пісаць так, каб яны, прачытаўшы мае творы, не хавалі іх са сваіх вачэй і ад людзей. У мяне заўсёды ляжаць лісты паперы, куды запісваю развагі. Часам узнікае думка, здаецца, надзвычай важная, а праходзіць дзень-два — і яна такою быць перастае. Бо пра кожную падзею, дзе б яна ні адбывалася — у асабістым жыцці, у жыцці дзяржавы, у свеце, — трэба разважаць без спешкі, імкнуцца шукаць усяму прычыны.

Калі хочацца прачытаць кнігу…

У свой час на мяне вельмі паўплывалі дзённікі Фёдара Янкоўскага, які доўга перажываў, што падчас вайны, у партызанах, схаваў агульны сшытак са сваімі запісамі і забыўся на тое месца. Я б хацеў сустрэцца з ім тады, калі ён гэты сшытак хаваў, і сказаць яму: «Паважаны Фёдар, схавай яго так, каб потым змог знайсці». Калі б было магчыма, то сустрэўся б і з Францішкам Багушэвічам, які шмат пацярпеў ад таго, што беларускае слова каралася.

Фота Кастуся Дробава.

Але самае патаемнае жаданне — сустрэцца з самім сабою ў 80-я гады. Я б расказаў Віктару Праўдзіну, які браўся за пяро, якая гэта катаржная праца — пісьменніцтва, і якое гэта жыццё, калі не можаш адысці ад пісьмовага стала, а ў свеце столькі цікавага! А ты сядзіш за чарговым раманам, каб потым хадзіць і ўгаворваць некага яго выдаць, а потым бегаць сярод людзей, каб яго купілі. Гэта, вядома ж, сарказм, бо ўсё часова, але працягласць гэтай часовасці мае значэнне. Кожны чалавек павінен быць запатрабаваны, калі ён спецыяліст.

У аднаго еўрапейскага аўтара (ужо не помню, каго) знайшоў: «Калі мне хочацца прачытаць кнігу, я саджуся і пачынаю яе пісаць». Сапраўды, на стварэнне трэба шмат часу. Чытаў раман Георгія Марчука «Мокры снег» — пазнаёміўся з часопісным варыянтам, які, мяркую, саступае арыгіналу. Чытаў гістарычны нарыс Івана Саверчанкі «Рой» і ўсцешаны, што ён сам, пасядзеўшы ў архівах, спрычыніўся да мастацкай працы. Сёння дужа шмат сучасных цікавых твораў, але пра іх чамусьці ніхто не ведае. Не хачу сказаць, што часопісы ці газеты ў нечым вінаватыя. Шмат скарэкціраваў інтэрнэт. Магчыма, нечага бракуе ў школьнай праграме.

Між тым у сённяшняй літаратуры мала патрыятызму. Але ён ёсць: узяць хаця б Ганада Чарказяна з яго цудоўнымі творамі, поўнымі любові да беларускай зямлі. А колькі ў нас такіх пісьменнікаў! Беларусы любяць увесь свет, але трэба любіць у першую чаргу свой народ, сваю радзіму!

Яўгенія ШЫЦЬКА

Пацеха з меха

Генрых ТАРАСЕВІЧ

Ода сяброўцы

Каб ты ведала, Геката,
Як жа я цябе люблю!
А калі збягаеш раптам
Ад мяне, я слёзы лью.

Твае вочы, быццам зоры,
Што праменнем свецяць мне.
І яны ўжо год каторы
Мрояцца штоночы ў сне.

Аксамітам ззяе скура,
А які дзівосны нос!
Без цябе мне жыць панура,
Невыносны, сумны лёс.

Ты заўсёды распазнаеш
Мой нярадасны настрой.
Ледзь кранеш — і адганяеш
Цяжкіх думак млосны рой.

Што тут скажаш? Гэта ўдача —
Бо з табой шчаслівы я
І ў багацці, і ў нястачы.
...Псінка любая мая!..



Малюнак Алега КАРПОВІЧА.

Міхась ПАЗНЯКОЎ

Разважанні

***

— Як хутка ўсе сталі дактарамі!
— Чаму гэта?
— Ды варта толькі чхнуць у натоўпе, усе адразу крычаць: «Каранавірус!»

***

Нішто так не стамляе, як самаізаляцыя, хоць ты і можаш нічога не рабіць.

***

Пасведчанне аб шлюбе раптам сталася падпіскай аб нявыездзе.

***

Як добра быць самім сабой, калі ты нікому не патрэбны.

***

Калі адны і тыя ж памылкі робяць вядомыя людзі, то гэтыя памылкі становяцца правіламі.

***

Добра, што там добра, дзе нас няма…

***

Пракуратура займаецца тымі, каму іншыя найчасцей зайздросцяць.

***

Многім жыць сумленна не дазваляе зарплата.

***

За ўсё жыццё ён не трымаў у руках ніводнай кніжкі, нават ашчаднай, бо яе замянілі на пластыкавую картку.

***

Яму так часта ўсміхалася Фартуна, што ім вельмі зацікавілася Феміда.

***

Правёўшы інструктаж, як не стаць ахвярай махляроў, праваахоўнік закончыў: «Паверце: нікому верыць нельга».

***

Часам падзяку літаратурнаму крытыку немагчыма выказаць словамі!

***

Калі ў паэта прастуда, то нельга яму пісаць вершы, бо яны выходзяць надта сырыя.

***

Калі аўтар сягоння не будзе выдаваць свае творы, то зарплаты на пражыццё яму хопіць.

***

Спелы пісьменнік ніколі не чырванее.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
намеснік галоўнага рэдактара — 377-99-72
адказны сакратар — 377-99-72
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98
аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98
аддзел мастацтва — 377-99-72
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны
для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк
14.05.2020 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 931

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1.
Індэкс 220013

Заказ — 1577

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.